Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава»
Кафедра ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры

Репозиторий ВГУ

**А.У. Русецкі**

# ВЫВУЧАЦЬ І ВЕДАЦЬ ГІСТОРЫЮ ВІЦЕБСКА

## (ДА ПАЧАТКАЎ «ВІЦЕБСКАЗНАЎСТВА»)

***Метадычны дапаможнік***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2013*

УДК 94(476.5)
ББК 63.3(4Беи-4Вит)
Р88

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава». Пратакол № 4 ад 20.12.2012 г.

Аўтар: прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар гістарычных навук **А.У. Русецкі**

Р э ц э н з е н т :
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат гістарычных навук *Т.С. Бубенька*

**Русецкі, А.У.**
**Р88** Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска (да пачаткаў «Віцебсказнаўства») : метадычны дапаможнік / А.У. Русецкі. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 48 с.

Метадычны дапаможнік «Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска» (да пачаткаў «Віцебсказнаўства») разлічаны на выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта, куратараў студэнцкіх груп, настаўнікаў гісторыі, наогул, на ўсіх, хто цікавіцца і вывучае гісторыю Віцебска. У якасці дадатка змешчаны слоўнік археалагічных і архітэктурных тэрмінаў.

**УДК 94(476.5)**
**ББК 63.3(4Беи-4Вит)**

© Русецкі А.У., 2013
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013

Репозиторий ВГУ

# У В О Д З І Н Ы

Цікавасць да гісторыі Віцебска ў яго жыхароў была заўсёды. Але яе асаблівы ўсплеск прыпаў на апошнюю трэць мінулага тысячагоддзя. Горад адсвяткаваў свой 1000-гадовы юбілей (праўда, даследчыкі сцвярджаюць, што дата заснавання Віцебска – 974 г. – не зусім правільная. Выказваецца думка, што аўтары «Віцебскага летапісу» С. Аверка і М. Панцырны хутчэй за ўсё памыліліся. Павінен быў быць 947 год. І спасылка на княгіню Вольгу, якая быццам была ў горадзе ў 974 г., не зусім карэктная: Вольга памерла ў 969 г.), праведзены і актыўна вядуцца археалагічныя даследаванні, адноўлены цудоўныя архітэктурныя помнікі: царква Дабравешчання (XII ст.), Васкрасенская (рыначная) царква і Успенскі сабор (другая палова XVIII ст.), а таксама Пакроўская царква, касцёл Святой Варвары. У стылізаваным плане адноўлена адно з абарончых збудаванняў Ніжняга замка – Духаўскі круглік.

Аднак сістэмнасці ў працы настаўнікаў гісторыі не стае, ды й метадычнай і вучэбнай літаратуры для «віцебсказнаўства» пакуль што не хапае. На жаль, дрэнна ведаюць гісторыю Віцебска і студэнты-гісторыкі ўніверсітэта. Для больш глыбокага і паслядоўнага азнаямлення і вывучэння гісторыі (і старажытнага, і сучаснага) Віцебска я і паспрабаваў распрацаваць праграму правядзення экскурсійна-вучэбных заняткаў па «віцебсказнаўстве». Галоўная мэта азначанага накірунку працы – выхаваць у студэнтаў, навучэнцаў інтарэс да гісторыі сваёй маленькай Радзімы, замацаваць у іх свядомасці любоў да свайго горада.

Праграма пабудавана па тэматычным прынцыпе. Тэматычныя раздзелы: «Старажытны Віцебск», «Верхні Замак», «Ніжні (Дольны) замак», «Узгорскі замак», «Задзвінне», «Па ваколіцах Віцебска» дапоўненыя экскурсійнымі маршрутамі «Мемарыяльныя дошкі на будынках г. Віцебска» і «Гарадскія вуліцы носяць іх імя», прапаноўваюць больш дэталёва вывучыць культуру і гісторыю горада ў адпаведнасці з параметрамі станаўлення і развіцця яго галоўных горадаўтваральных адзінак, а таксама пазнаёміцца з найбольш цікавымі месцамі, якія знаходзяцца непадалёк ад Віцебска і аказвалі значны ўплыў на развіццё яго гістарычна-культурнага патэнцыялу.

Па кожным раздзеле праграмы прапануюцца наступныя экскурсіі:

– ***«Старажытны Віцебск»*** – абагульняючая экскурсія па найбольш старажытнай частцы горада – Верхнім, Ніжнім і Узгорскім замках (аб Задзвінні і іншых раёнах горада можна было б распавядаць на высокім беразе р. Заходняя Дзвіна, каля адноўленага Успенскага сабора);

– «***Верхні замак***» – экскурсія па тэрыторыі Верхняга замка (дзядзінца) – ад вул. Замкавая да цяперашняга Пушкінскага маста і па плошчы Свабоды. Археалогія Верхняга Замка;

Репозиторий ВГУ

– «***Ніжні (Дольны) замак***» – экскурсія па тэрыторыі Ніжняга замка (ад р. Заходняя Дзвіна па вул. Замкавая да амфітэатра). Асаблівую ўвагу рэкамендуецца ўдзяліць такім архітэктурным збудаванням апошняга трыццацігоддзя, як амфітэатр свята мастацтваў «Славянскі базар», стылізаваны будынак Духаўскога кругліка і комплекс пірамід «Марка-сіці». Гэта, бадай што, адно з тых месцаў у Віцебску, дзе вельмі цесна пераплецены самыя розныя архітэктурныя стылі і накірункі; археалагічныя знаходкі на тэрыторыі Ніжняга замка;

– «***Узгорскі замак***» – экскурсія па тэрыторыі Узгорскага замка (ад вул. Талстога і ратушы ўверх па вул. Узгорская (былая вул. Суворава), камісара Крылова і беразе р. Заходняя Дзвіна да плошчы імя У. Леніна. Асаблівую ўвагу рэкамендуецца звярнуць на такія архітэктурныя помнікі, як Успенскі сабор і былы палац губернатара;

– «***Задзвінне***» – экскурсія па Віцебску ад левага берага р. Заходняя Дзвіна да чыгуначнага вакзала і касцёла Святой Варвары;

– «***Па ваколіцах Віцебска***» – экскурсія па (цяпер ужо гарадскіх тэрыторыях) Лучосе (былая сядзіба Лукішкі), Маркаўшчыне (былы Маркаўскі манастыр), а таксама ў Мазалаве (былая сядзіба Мілае, дзе жыў пісьменнік Ігнацій Манькоўскі) і Здраўнёва (на сядзібу І.Я. Рэпіна). Рэкамендуецца наведаць гарадзішчы ў вёсках Баронікі і Лужасна.

Прапануецца правядзенне не толькі экскурсій, але і выкананне творчых заданняў (рэфератаў, паведамленняў па абранай тэме, афармленне сваіх расповедаў у факультэцкіх і школьных газетах, класных альбомах, школьных музеях і г.д.). Пасля экскурсійных мерапрыемстваў праводзяцца ўрокі-семінары, заліковыя заняткі, выстаўкі творчых прац, конкурсы знатакоў і інш. Навучэнцы збіраюць рэпрадукцыі карцін, старыя фатаграфіі, робяць ксеракопіі, аналізуюць матэрыялы аб гісторыі Віцебска ў перыядычным друку, канспектуюць літаратуру па гісторыі і культуры старажытнага Віцебска. У школе для замацавання матэрыялу і праверкі ведаў пасля правядзення экскурсіі можна выкарыстаць элементы гульні ў выглядзе віктарыны. Асобныя формы творчага ўзаемадзеяння настаўніка і навучэнца прыводзяцца ў якасці прыкладу.

Дадатковыя экскурсіі:

– «Мемарыяльныя дошкі на будынках г. Віцебска»;
– «Гарадскія вуліцы носяць іх імя».

Рэпазіторый ВДУ

# I. АГЛЯДНАЯ ЭКСКУРСІЯ ПА СТАРАЖЫТНЫМ ВІЦЕБСКУ

ТЭМА: **Старажытны Віцебск X–XVIII стст.**

***Мэта:*** паказаць навучэнцам старажытны Віцебск як помнік нацыянальнай гісторыі, нацыянальнай мастацкай культуры (прафесійнага і народнага мастацтва), як важны гарадскі цэнтр палітычнага, рэлігійнага і культурнага жыцця. Прасачыць крок за крокам, як паступова складваўся адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі. Звярнуць увагу на паступовасць забудовы горада, жывапіснасць і гарманічнасць архітэктурных пабудоў і ансамбляў.

***Методыка:*** першапачаткова на ўроках віцебсказнаўства вывучыць гісторыю ўзнікнення Віцебска як горада, ператварэння яго ў буйны адміністрацыйна-культурны цэнтр, выкарыстоўваючы раздатачны матэрыял (рэпрадукцыі з малюнкаў старых пабудоў, гарадскіх планаў забудовы і інш.). Правесці работу над тэрмінамі старажытна-беларускай культуры: архітэктура, замак, крэпасць, палац, а таксама малавядомымі архітэктурнымі тэрмінамі: партал, галерэя, пілястры, закамары, прытвор, алтар, барабан, алкіды і інш. Пазнаёміцца з рознымі стылямі і ўплывамі ў старажытнабеларускай архітэктуры – візантыйскім, балгарскім, гуцульскім, готыкай, барока і т.д. Наведаць аддзел археалагічных знаходак у абласным краязнаўчым музеі.

***Прапануецца напісаць рэфераты на тэмы:***

– «Паходжанне назвы Віцебск. Версіі аб узнікненні горада»;
– «Існаванне Віцебска ў X – пачатку XIV ст. Адносіны з суседзямі»;
– «Помнікі віцебскай старажытнасці. Абарончыя, культавыя будынкі, гарадская забудова»;
– «Маё жыццё ў старажытным Віцебску (абраць ці адзін з часовых прамежкаў, ці адзін з замкаў горада)».

*Можна прапанаваць навучэнцам скласці крыжаванку або сканворд* па азначанай тэме, падрыхтаваць сценгазету.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Галоўныя гістарычныя этапы забудовы старажытнага Віцебска.
2. Першапачатковыя звесткі аб заснаванні Віцебска (можна выслухаць экскурсантаў аб тым, чаму менавіта ў гэтым месцы ўзнік Віцебск).
3. Віцебск ва ўзаемаадносінах з суседзямі.
4. Гандлёвыя сувязі Віцебска ў X – пачатку XIVст.
5. Агляд звестак аб Верхнім замку (дзядзінцы). Роля Вялікага князя літоўскага Вітаўта ў яго развіцці.
6. Ніжні замак як гандлёва-рамесны цэнтр старажытнага Віцебска.

Репозиторий ВГУ

Замкавая гара – пачатак горада. Колькі слоў аб археалагічных раскопках. Аглядная размова.

7. Гутарка (тэзісная) аб Узгорскім замку і яго ролі ў завяршэнні панарамы горадабудаўнічай структуры сярэдневяковага Віцебска.

8. Гісторыя Задзвіння (у агульным пераказе).

9. Архітэктурныя помнікі канца XVIII – IX ст. на тэрыторыі старажытнага Віцебска (дом генерал-губернатара, мужчынскае і жаночае епархіяльныя духоўныя вучылішчы і інш.).

10. Гарадская забудова Віцебска ў X–XVIII стст. Новыя з'явы ў XIX – пачатку XX ст.

11. Грамадскія забудовы на тэрыторыі старажытнага Віцебска ў савецкі час: тэатр імя Я. Коласа, гасцініца «Віцебск», амфітэатр міжнароднага свята мастацтваў «Славянскі базар», будынкі філармоніі, медыцынскага, техналагічнага і педагагічнага інстытутаў, Палаца культуры фабрыкі імя КІМ (цяпер гарадскі цэнтр культуры) і інш. У агульным кантэксце гутаркі назваць і ахарактарызаваць новыя пабудовы, узведзеныя ва ўмовах суверэннай Рэспублікі Беларусь (будынкі дзяржаўных ветэрынарнай акадэміі, тэхналагічнага і медыцынскага ўніверсітэтаў, выкананы ў стылізаваным плане помнік абарончай архітэктуры XVI ст. Духаўскі круглік, комплекс «пірамід» (цэнтр «Марка-сіці»), цэнтральны спартыўны комплекс (ЦСК) і інш.).

Пры правядзенні экскурсіі адзначаецца асобнае, значнае месца кожнага з замкаў Віцебска ў яго станаўленні і развіцці, ва ўзбагачэнні беларускай мастацкай культуры.

***Вывад:*** старажытны і сярэдневяковы Віцебск прадстаўляе сабой унікальную гістарычна-мастацкую з'яву, дзе пераплецены і знітаваны ў адзінае цэлае розныя палітычныя, сацыяльныя і рэлігійныя з'явы і плыні, нацыянальныя, візантыйскія і заходне-еўрапейскія мастацка-творчыя матывы. Па сутнасці, гэта адзін з самых «мазаічных» беларускіх гарадоў, у якім і ў цяперашні час вядуцца актыўныя работы па аднаўленні гістарычна-архітэктурных ансамбляў, вывучэнні археалагічных напластаванняў старажытна-сярэдневяковага Віцебска.

## Урок-віктарына

***Мэта:*** праверыць узровень ведаў навучэнцаў, атрыманых у час экскурсіі, удакладніць прабелы, замацаваць інтарэс да ведання гісторыі Віцебска.

***Абсталяванне:*** ксеракапіравальныя ілюстрацыі старажытных помнікаў архітэктуры, фатаграфіі сучасных месцаў іх былога распалажэння (для суаднясення), выстава навучэнцкіх рэфератаў, абмеркаванне лепшых (вызначае выкладчык або навучэнцкае бюро віцебсказнаўчай секцыі гістарычнага гуртка), кнігі аб старажытна-сярэдневяковым Віцебску (А.П. Сапуноў, М.М. Шчакаціхін, Ю.Н. Кішык, Т.І. Чарняўская і інш.),

Репозиторий ВГУ

фотакопіі археалагічных знаходак X–XVIII стст. з абласнога краязнаўчага музея, графічныя планы-забудовы г. Віцебска (з кнігі Ю.Н. Кішыка «Панарама старога Віцебска»). Можна зрабіць сіламі навучэнцаў карту-схему размяшчэння гісторыка-культурных пабудоў г. Віцебска.

***Літаратура***


1. Бубенько, Т.С. Посад Витебска X – первой половины XIV вв.: автореф. … дис. на соискание ученой степени кандидата исторических наук / Т.С. Бубенько. – Л., 1991.
2. Кішык, Ю.Н. Панарама старога Віцебска / Ю.Н. Кішык. – Мінск, 1995.
3. Красьянскі, В. Чарцёж месца Віцебску 1664 г. як дакументальны помнік гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва / В. Красьянскі. – Мінск, 1928.
4. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.
5. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.
6. Ткачев, М.А. Итоги археологического изучения Витебска в 1976–1980 гг. В книге «Древнерусские государства и славяне» / М.А. Ткачев, Л.В. Колединский. – Минск, 1983.
7. Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска / Т.І. Чарняўская. – Мінск, 1980.
8. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск, 1993.
9. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мінск, 1984. – Т. І.
10. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII вв. / Ю.А. Якимович. – Мінск, 1991.


**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант.
II. Мэтавая ўстаноўка. Уступнае слова настаўніка.
III. Правядзенне віктарыны.

Пытанні да віктарыны

1. Якія плямёны жылі на тэрыторыі Віцебска да яго ўзнікнення? (Полацкія крывічы, а да іх прыходу ў Прыдзвінне – балцкія плямёны)
2. Якія гістарычныя даты звязаны з заснаваннем горада? (947, 974, 1021)
3. З якіх частак складаўся старажытны Віцебск? (Віцебскі пасад, горад Верхні, Ніжні, Узгорскі замак, Заручайская слабада, Задунайская слабада, Задзвінне)



Репозиторий ВГУ

4. Дзе на тэрыторыі Віцебска знаходзіліся старэйшыя пабудовы? (У Верхнім замку, на дзядзінцы)

5. Калі прыкладна ўзнік Верхні замак? (Другая палова XIII ст.)

6. Якія пабудовы знаходзіліся ў Верхнім замку? (Княжацкая рэзідэнцыя, цэрквы Архангела Міхаіла і Пятніцкая, абарончыя вежы і брамы)

7. Што ўяўляў сабой Ніжні замак? (Крэпасць з магутнымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі)

8. Якімі былі адносіны Віцебска з суседзямі? (З 1021 г. ён у складзе Полацкага княства, з 1101 па 1129 г. самастойнае княства, у 30–40-я гады XII ст., першай трэці XIII ст. – у залежнасці ад Смаленска)

9. У якім годзе Віцебск згубіў сваю самастойнасць і чаму? (У 1320 г., пасля таго, як памёр апошні віцебскі князь Яраслаў Васільевіч, а горад, як пасаг яго дачкі Марыі, перайшоў да літоўскага князя Вітаўта)

10. Якія гандлёвыя шляхі ішлі праз Віцебск? (Мерыдыяльны – з вараг у грэкі і шыротны – з Балтыкі ў Каспій)

11. Як і калі Віцебск удзельнічаў у міжнародных дагаворах? (У 1222 і 1229 гг. – удзельнічаў у заключэнні гандлёвага дагавора паміж Рыгай, Смаленскам і Полацкам)

12. Праўда ці не, што князь Аляксандр Неўскі браў шлюб у Віцебску? (Не, гэта адмысловая легенда, ён вянчаўся ў царкве рускага горада Тарапца)

13. Якія з найбольш старажытных пабудоў захаваліся ў Віцебску? (Царква Дабравешчання)

14. Якія плошчы ў Віцебску самыя старажытныя? (Плошча Ніжняга замка (цяпер Тэатральная) і плошча Верхняга замка (цяпер Свабоды)

15. Дзе размяшчалася і каму было прысвечана першае мастацкае палатно? (У царкве Св. Духа, прысвячалася кн. Вітаўту і яго жонцы Улляне)

16. Калі пачалася забудова Узгорскага замка? (У сярэдзіне XIII ст., у канцы XVI ст. гандлёва-эканамічны цэнтр Віцебска перанесены сюды з Ніжняга замка)

17. Якія найбольш значныя пабудовы знаходзіліся на тэрыторыі Узгорскага замка? (Ратуша, Васкрасенская і Увядзенская цэрквы, Гасціны двор, гандлёвыя рады, іезуіцкі калегіум, Успенскі сабор, губернатарскі палац)

18. Якія Троіцкія цэрквы вядомы ў Віцебску? (царква Св. Троіцы на Пескавaціку, Троіцкая царква Маркава манастыра).

19. Якія найбольш значныя пабудовы размешчаны ў Задзвінні? (Царква Св. Ільі Прарока, Пакроўская і Сімеонаўская цэрквы, саляныя склады, касцёл Св. Варвары, чыгуначны вакзал)

20. Хто такі Іясафат Кунцэвіч? (Уніяцкі архіепіскап)

21. Калі адбылося і чым закончылася паўстанне гараджан супраць уніяцкага засілля? (У 1623 г. – вялікай паразай, па загадзе Вялікага канцлера

Репозиторий ВГУ

Льва Сапегі 78 чалавек былі прыгавораны да пакарання смерцю, быў знішчаны ратушны звон, горад пазбавілі Магдэбургскага права і інш.)

22. Якія з’явы маюць адносіны да Айчыннай вайны 1812 г.? (У 1812 г. тут была штаб-кватэра Напалеона, 13–15 ліпеня і 26 кастрычніка адбыліся бітвы рускіх і французскіх войскаў, а ў 1912 г. па праекце скульптара І. Фаміна насупраць губернатарскага палаца быў устаноўлены помнік героям бітвы)

23. Калі Віцебск увайшоў у склад Расіі? (1772)

24. Хто з вядомых архітэктараў будаваў Успенскі сабор? (Італьянец Іосіф ІІІ Фантана)

25. Назавіце прозвішча вядомых дзеячаў славянскай культуры, звязаных з Віцебскам (Г. Дзяржавін, А. Пушкін, Т. Шаўчэнка, М. Гогаль, І. Лажэчнікаў, Г. Успенскі, І. Рэпін, К. Савіцкі, С. Маршак).

26. Калі ў Віцебску была ўстаноўлена Савецкая улада? (27 кастрычніка 1917 г.)

27. Чым вядома у Віцебску Пакроўская вуліца? (Тут знаходзіцца сядзіба (цяпер гэта музей), дзе жыў мастак М. Шагал)

28. Назавіце гады жыцця М. Шагала ў Віцебску і найбольш значныя работы, створаныя ім тут (... 1887–1907, 1914–1915, 1918–1920; «Я і вёска», «Дом у Лёзне», «Над Віцебскам», «Яўрэй у чырвоным» і інш.)

29. Калі ў Вялікай Айчыннай вайне горад Віцебск быў вызвалены Савецкай Арміяй? (26 чэрвеня 1944 г.)

30. Што такое «Славянскі базар у Віцебску»? (Міжнародны фестываль мастацтваў, які штогод праходзіць у ліпені)

IV. Падвядзенне вынікаў віктарыны (вынік падводзяць навучэнцы пад кіраўніцтвам настаўніка)

V. Ацэнка ведаў навучэнцаў.

VI. Дамашняе заданне.

Репозиторий ВГУ

# II. ЭКСКУРСІЯ ПА ВЕРХНІМ ЗАМКУ

ТЭМА: **Верхні горад (дзядзінец) – адміністрацыйны цэнтр старажытнага Віцебска**

***Мэта:*** паказаць навучэнцам ролю Верхняга замка як адміністрацыйнай часткі горада, раскрыць формы княжаскага кіравання старажытным Віцебскам, а таксама значэнне Верхняга горада для наступнага развіцця гарадской тэрыторыі.

***Літаратура***


1. Аверка, С. Витебская летопись / С. Аверка, М. Панцирный // В кн.: Сапунов, А.П. Витебская старина. – Витебск, 1883. – Т. 1.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. Очерки истории Северной Белоруссии / Л.В. Алексеев. – М., 1966.
3. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993.
4. Бубенька, Т.С. Вынікі вывучэння гандлёва-рамеснага пасада раннесярэднявечнага Віцебска (1981–1989 гг.) / Т.С. Бубенька // У кн.: Гісторыка-археалагічны зборнік. – Мінск, 1993. – Ч. 1; Бубенько, Т.С. Торговые и культурные связи Витебска (по материалам Нижнего замка); Планировка и застройка посада средневекового Витебска / Т.С. Бубенько // У кн.: Гісторыка-археалагічны зборнік. – Мінск, 1996. – № 8; Бубенька, Т.С. Да пытання аб лакалізацыі царквы Св. Параскевы Пятніцы ў Віцебску / Т.С. Бубенька // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1.
5. Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1984.
6. Літаратура і мастацтва Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1984. – Т. 1.
7. Витебск. Энциклопедический справочник. – Минск, 1988.
8. Кішык, Ю.Н. Панарама старога Віцебска / Ю.Н. Кішык. – Мінск, 1995.
9. Колединский, Л.В. О церкви Св. Михаила в Витебске (конец XI – начало XIII в.) / Л.В. Колединский // В кн.: Проблемы изучения древнерусского зодчества. – СПб., 1996; Колединский, Л.В. Летописный Витебск: истоки и генезис / Л.В. Колединский // В сб.: Города Верхней Руси. Истоки и становление. – Торонец, 1990.
10. Красьнянскі, В. Чарцёж месца Віцебска 1664 г. / В. Красьнянскі. – Мінск, 1928.
11. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.
12. Ткачев, М.А. Замки Белоруссии / М.А. Ткачев. – Минск, 1987.
13. Ткачоў, М. Раскопкі на Верхнім замку / М. Ткачоў, Л. Калядзінскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 1.




Репозиторий ВГУ

***Заданне:*** Зрабіць выпіскі з літаратуры аб усім, што мае адносіны да Верхняга замка, знайсці рэпрадукцыі карцін, зрабіць ксеракопіі з малюнкаў будынкаў Верхняга замка ў гістарычнай літаратуры; вывучыць гісторыю і легенды аб Замкавай гары; сустрэцца з археолагамі, якія вялі археалагічныя даследаванні на Верхнім замку (Т.С. Бубенька, Л.В. Калядзінскі, В.М. Ляўко і інш.); пазнаёміцца з матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія знаходзяцца ў Віцебскім краязнаўчым музеі, зрабіць апісанне найбольш цікавых з іх. Сфармуляваць і запісаць некалькі складаных і цікавых пытанняў аб Верхнім замку. Паказаць яго сувязь з Задунайскай слабадой і яе знакамітымі помнікамі (Кстоўская гара, Мікалаеўская (Завіцьбенская) царква і царква Іаана Прадцечы (Пакроўская), водаадводная сістэма XVIII ст. і інш.).

**План правядзення экскурсіі:**

1. Агульная характарыстыка тэрыторыі (дзядзінец) і пабудоў Верхняга замка ў X–XIII стст.
2. Царква Архангела Міхаіла як адна з першых культавых пабудоў Віцебска. Яе гістарычны лёс.
3. Вуліцы, перавулкі, масты Верхняга замка.
4. Верхні замак і Задунайская слабада.
5. Абарончыя збудаванні Верхняга замка.
6. Грамадзянскія пабудовы Верхняга замка.
7. «Чарцёж 1664 г.» як адзін з галоўных вытокаў для вывучэння гісторыі Верхняга замка.
8. Забудовы Верхняга замка ў XVII–XVIII стст.
9. Тэрыторыя былога Верхняга замка ў XIX ст.
10. Верхні замак і наш час.
11. Значэнне Верхняга замка для развіцця сярэдневяковага Віцебска.

***Вывад:*** сфарміраваны, як адміністрацыйна-гаспадарчы цэнтр старажытна-сярэдневяковага Віцебска, (дзядзінец) Верхні замак адыграў значную ролю ў станаўленні і развіцці горада, спрыяў складванню і развіццю такіх яго частак, як «Узгорскі замак» і «Задунайская слабада». У больш позні час (XIX–XX стст.) тэрыторыя Верхняга замка стала асновай для фарміравання гістарычнага ядра г. Віцебска.

Для замацавання матэрыялу прапануецца падрыхтаваць даклады і паведамленні аб гісторыі развіцця і існавання Верхняга замка, яго ролі і значэнні для развіцця г. Віцебска. Агляд наяўнай літаратуры і рэкамендацыі па яе выкарыстанні робіць настаўнік.

Рэпазіторый ВГУ

## УРОК

## ТЭМА: **Верхні замак**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з цікавейшым месцам у старажытна-сярэдневяковым Віцебску – Верхнім замкам, раскрыць яго ролю і значэнне для складвання і развіцця горадабудаўнічай забудовы ў больш познія часы, пазнаёміць са знакамітымі помнікамі як старажытнабеларускай архітэктуры, так і больш новых архітэктурных дасягненняў. Прапануецца таксама распавядаць аб Задунайскай слабадзе, якая тэрытарыяльна прылягала да Верхняга замка.

***Абсталяванне:*** ксеракопіі з малюнкаў з кніг, якія маюць адносіны да Верхняга замка, «Чарцёж 1664 г.», фотаздымкі археалагічных знаходак з Верхняга замка (або перасоўная экспазіцыя гэтых знаходак з абласнога краязнаўчага музея). Выстава кніг і літаратуры, якая можа быць выкарыстана пры напісанні навучэнцамі рэфератаў і паведамленняў аб Верхнім замку Віцебска.

### Ход урока

I. Арганізацыйны момант.
II. Мэтавая ўстаноўка.
III. Тлумачэнні настаўніка.

### *План вывучэння навага матэрыялу*

1. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення Верхняга замка. Складванне яго ў адміністрацыйна-гаспадарчы цэнтр горада.
2. Верхні замак як найбольш умацаваная частка горада. З гісторыі ваенных падзей.
3. Архітэктурная забудова Верхняга замка. Першыя культавыя збудаванні (напр.: царква Архангела Міхаіла).
4. Адметнасці пабудовы Верхняга замка як аднаго з найбольш цікавых помнікаў старажытнасярэдневяковай беларускай архітэктуры.
5. Задунайская слабада – раён старажытнага Віцебска, які межаваў з Верхнім замкам.
6. Гісторыка-археалагічныя помнікі Задунайскай слабады.
7. Гістарычны лёс Верхняга замка.
8. Развіццё і забудова тэрыторыі Верхняга замка ў XIX–XX стст.
9. Значэнне Верхняга замка для гістарычнага развіцця г. Віцебска.

### Пытанні для замацавання

1. Калі ўзнік (X–XII стст.) і як складваўся Верхні замак у канцы XIV – XVII ст.?

Рэпазіторый ВГУ

2. Які дакумент дазваляе прасачыць архітэктурна-планіровачную структуру Верхняга замка?

3. Што Вам вядома аб Замкавай гары?

4. Якімі найбольш вядомымі пабудовамі характарызуецца архітэктура Верхняга замка?

5. Якой была сувязь Верхняга замка з Задунайскай слабадой? Што Вам вядома аб гэтай гістарычнай частцы Віцебска?

6. Якія вядомыя пабудовы знаходзяцца на тэрыторыі Верхняга замка ў цяперашні час?

7. Аб чым сведчаць археалагічныя знаходкі на тэрыторыі Верхняга замка?

8. У чым значэнне Верхняга замка для гістарычнага развіцця г. Віцебска?

***Вывад:*** Верхні замак Віцебска (дзядзінец) як адміністрацыйна-гаспадарчы і абарончы цэнтр Віцебска, а потым яго гістарычная тэрыторыя, на працягу ўсяго існавання (ад старажытнасці да нашага часу) горада выконвалі ролю своеасаблівай «дамінанты» ў жыцці горада. Па сутнасці, і ў наш час – гэта цэнтральная частка Віцебска.

Репозиторий ВГУ

# III. ЭКСКУРСІЯ ПА НІЖНІМ ЗАМКУ

ТЭМА: **Ніжні замак і яго роля ў развіцці Віцебска**

***Мэта:*** праз гісторыю Ніжняга замка паказаць навучэнцам, як развіваўся старажытны Віцебск ад яго пачатку да XVIII ст.

### *Літаратура*


1. Аверка, С. Витебская летопись / С. Аверка, М. Панципрный // В кн.: Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993.

3. Бубенько, Т.С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XVI века) / Т.С. Бубенько. – Витебск, 2004.

4. Бубенько, Т.С. Раскопки оборонительной башни в Витебске / Т.С. Бубенько, М.А. Ткачев // В кн.: Археологические открытия 1984. – М., 1986.

5. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск, 1988.

6. Красьнянскі, В. Чарцёж месца Віцебска 1664 г. / В. Красьнянскі. – Мінск, 1928.

7. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч. Праз гісторыю ў сучаснасць / А. Русецкі. – Мінск, 2000.

8. Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1984.

9. Літаратура і мастацтва Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1984. – Т. 1.

10. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.

11. Сяліцкі, А.А. Фрэскі царквы Благавешчання ў Віцебску / А.А. Сяліцкі // У кн.: Помнікі старажытнай беларускай культуры. – Мінск, 1984.

12. Ткачев, М.А. Замки Белоруссии / М.А. Ткачев. – Минск, 1987.

13. Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска / Т.І. Чарняўская. – Мінск, 1980.

14. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск, 1993.

15. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. / Ю.А. Якимович. – Минск, 1991.


***Заданне:*** Знайсці і выпісаць з літаратуры ўсё, што мае адносіны да Ніжняга замка; знайсці рэпрадукцыі карцін, зрабіць ксеракопіі малюнкаў у гістарычнай літаратуры, што маюць адносіны да гэтага месца ў жыцці Віцебска; сустрэцца з археолагамі, якія вялі раскопы на тэрыторыі Ніжняга замка (напр.: кандыдат гістарычных навук, дацэнт ВДУ імя П.М. Машэрава Т.С. Бубенька і інш.); пазнаёміцца з матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія знаходзяцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі; наведаць царкву Дабравешчання, аднаўленне якой адбылося ў 1990-я гады.



Репозиторий ВГУ

Сфармуляваць і запісаць тры–пяць самых складаных і цікавых пытанняў аб Ніжнім замку.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Уплыў геаграфічнага палажэння і прыродных умоў на фарміраванне тэрыторыі старажытнага Віцебска. Віцебскі пасад.
2. Агульная характарыстыка тэрыторыі і пабудоў Ніжняга замка. Ніжні замак і Віцебскі пасад, іх гістарычная сувязь паміж сабой.
3. Царква Дабравешчання – галоўная каштоўнасць архітэктурнай спадчыны XII ст.
4. Ход будаўніцтва царквы і яе мастацкія рашэнні.
5. Унутраны інтэр’ер царквы. Фрэскавы жывапіс царквы Дабравешчання.
6. Лёс царквы Дабравешчання ад XII ст. да нашых дзён.
7. Археалагічныя раскопы і знаходкі на тэрыторыі Ніжняга замка.
8. Ніжні замак як адзін з цэнтраў рамесніцтва і гандлю.
9. Грамадзянская забудова Ніжняга замка.
10. Абарончыя збудаванні Ніжняга замка.
11. Сувязь Ніжняга замка са знешнім светам і іншымі часткамі горада. Ніжні замак і Заручайская слабада.
12. Гістарычны лёс Ніжняга замка Віцебска.
13. Былы «Ніжні замак» у сучасным афармленні: экскурсійныя адгалінаванні:

а) прайсці каля «пірамідальнага» цэнтра «Марка-сіці» праз падземны пераход пад вуліцай імя У. Леніна да адноўленага ў стылізаваным плане Духаўскага круглік;

б) берагам ракі Заходняя Дзвіна прайсці ад царквы Дабравешчання праз парк Пераможцаў да плошчы Перамогі.

***Вывад:*** Ніжні замак Віцебска – адзін з найбольш старажытных гістарычна-культурных помнікаў Беларусі.

Для замацавання матэрыялу прапануецца падрыхтаваць даклады і паведамленні аб гісторыі развіцця і існавання Ніжняга замка, Віцебскага пасада, царквы Дабравешчання і інш.

## УРОК

ТЭМА: **Ніжні замак**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з адным з самых старажытных гістарычных раёнаў Віцебска – Ніжнім замкам, гісторыя якога звязана з існаваннем на яго тэрыторыі ўнікальнага помніка старажытнабеларускай архітэктуры – царквы Дабравешчання, паказаць яго сувязь з Віцебскім пасадам, а таксама Заручайскай слабадой, якая межавала з замкам.



Репозиторий ВГУ

***Абсталяванне:*** ксеракопіі з малюнкаў з кніг, якія маюць адносіны да Ніжняга замка, ілюстрацыі Дабравешчанскай царквы (ад старажытнасці да нашых дзён), фотаздымкі археалагічных знаходак з Ніжняга замка (або перасоўная экспазіцыя гэтых знаходак). Выстава кніг і літаратуры, якая можа быць выкарыстана пры напісанні навучэнцамі рэфератаў і паведамленняў аб Ніжнім замку Віцебска.

**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант.
II. Мэтавая ўстаноўка.
III. Тлумачэнні настаўніка.

***План вывучэння новага матэрыялу***

1. Роля Ніжняга замка ў станаўленні і развіцці старажытнага Віцебска. Ніжні замак і Віцебскі пасад.
2. Асаблівасці планіроўкі Ніжняга замка.
3. Царква Дабравешчання: дыскусіі вакол даты яе будаўніцтва.
4. Царква Дабравешчання як прыклад сінтэзу выяўленчых мастацтваў у старажытнабеларускай мастацкай культуры.
5. Лёс Дабравешчанскай царквы.
6. Рамесніцтва і гандаль на тэрыторыі Ніжняга замка.
7. Значэнне Ніжняга замка для развіцця Віцебска ў XII–XVII стст.
8. Ніжні замак і Заручайская слабада.

**Пытанні для замацавання**

1. Калі і як узнік і сфарміраваўся Ніжні замак Віцебска?
2. Якая гістарычная сувязь паміж Ніжнім замкам і Віцебскім пасадам?
3. Чым характарызуецца жыццядзейнасць гараджан Ніжняга замка?
4. Якую ролю ў жыцці Ніжняга замка адыгрывала царква Дабравешчання?
5. Якія адметныя рысы вылучаюць царкву Дабравешчання з шэрагу іншых помнікаў старажытнабеларускай мастацкай культуры?
6. Што Вам вядома пра такі помнік архітэктуры, як царква Святога Духа у Заручайскай слабадзе?
7. Якія найбольш цікавыя рэчы знойдзены археолагамі на Ніжнім замку? Аб чым яны сведчаць?

***Вывад:*** Ніжні замак Віцебска адыграў значную ролю ў развіцці старажытнага горада. На яго тэрыторыі быў пабудаваны адзін з найбольш знакамітых помнікаў архітэктуры Беларусі – царква Дабравешчання, якая адноўлена і цяпер з’яўляецца дзейнічаючай.

IV. Дамашняе заданне.



Репозиторий ВГУ

# IV. ЭКСКУРСІЯ ПА УЗГОРСКІМ ЗАМКУ

ТЭМА: **Узгорскі замак – адзін з апошніх архітэктурных комплексаў сярэдневяковага Віцебска**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з адным з апошніх архітэктурных помнікаў позняга сярэднявечча ў Віцебску – Узгорскім замкам, раскрыць яго ролю і значэнне ў жыцці горада ў XIII – першай палове XVII ст., пазнаёміць з адметнымі гістарычнымі падзеямі, што адбываліся на яго тэрыторыі (наданне гораду Магдэбургскага права, паўстанне супраць уніяцкага засілля ў 1623 г. і г.д.), помнікамі, якія фарміравалі архітэктурнае аблічча гэтай часткі горада (і ў XIX, і ў XX стст.). Рэкамендуецца таксама азнаёміцца з адкрыццямі віцебскіх археолагаў, зробленымі на тэрыторыі замка.

***Літаратура***


1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993.
2. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск, 1988.
3. Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1984; Левко, О.Н. Экскурсия по древнему Витебску / О.Н. Левко. – Минск, 1984; Левко, О.Н. Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1989.
4. Літаратура і мастацтва Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1984. – Т. 1.
5. Красьнянскі, В. Чарцёж месца Віцебска 1664 г. / В. Красьнянскі. – Мінск, 1928.
6. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.
7. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.
8. Чарняўскі І. Віцебская ратуша / І. Чарняўскі, І. Цішкін // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2.
9. Хмяльніцкая, Л. З гісторыі Віцебскага базыльянскага кляштару / Л. Хмяльніцкая // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2.
10. Цішкін, І. Храм на рынку ў Віцебску / І. Цішкін // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2.
11. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск, 1978.
12. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII вв. / Ю.А. Якимович. – Минск, 1991.


***Методыка:*** папярэдне вядзецца работа над такімі паняццямі, як «віцебская архітэктурная школа», «віленскае барока», «класіцызм», «эклектыка», «мадэрн». Пажадана пазнаёміць навучэнцаў з біяграфіяй такіх



Репозиторий ВГУ

вядомых архітэктараў, як Іосіф ІІІ Фантана, І. Фамін і інш. Пажадана пазнаёміць навучэнцаў з трагедыяй Ул. Караткевіча «Званы Віцебска», прысвечанай віцебскаму паўстанню 1623 г.

***Заданне:*** Знайсці і выпісаць з літаратуры ўсё, што мае адносіны да Узгорскага замка; знайсці рэпрадукцыі карцін (эцюдаў І.Я. Рэпіна да карціны «Забойства Іасафата Кунцэвіча»), зрабіць ксеракопіі з малюнкаў у гістарычнай і краязнаўчай літаратуры, што маюць адносіны да гэтага месца ў жыцці Віцебска; пазнаёміцца з матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія знаходзяцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі; наведаць гарадскую ратушу. Сфармуляваць і запісаць тры–пяць самых значных пытанняў аб Узгорскім замку.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Час узнікнення і першапачатковыя межы Узгорскага замка.
2. Пазнаёміць навучэнцаў з вынікамі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Узгорскага замка.
3. Найбольш значныя архітэктурныя пабудовы – Васкрасенская (Рыначная) царква, Іезуіцкі калегіум, гандлёвыя рады, Саборная плошча, Ратуша). Абарончыя збудаванні.
4. Даць больш дэталёвае тлумачэнне па такому ўнікальнаму помніку віцебскай архітэктуры, як Васкрасенская (Рыначная) царква. Гісторыя аднаўлення.
5. З гісторыі Віцебскай ратушы.
6. Да надання Віцебску Магдэбургскага права.
7. Базыльянскі комплекс – галоўны ўніяцкі цэнтр у Віцебску.
8. Падзеі 1623 г., іх трагічныя вынікі.
9. Іезуіцкі калегіум: ідэалогія, выхаванне, навучанне.
10. Узгорскі замак пасля 1772 г. Перабудова, пераўтварэнне базыльянскага комплексу ва Успенскі кафедральны сабор. Пазнаёміцца з адноўленым Успенскім саборам.
11. Грамадзянская забудова Узгорскага замка. Жылыя дамы канца XVII – пачатку XX ст.
12. Вуліцы і переулкі Узгорскага замка.
13. Губернатарскі палац.
14. Помнік героям Айчыннай вайны 1812 г. Архітэктар І. Фамін.
15. Значэнне Узгорскага замка ў жыцці Віцебска ў познім сярэднявеччы і больш позні час (XIX–XX стст.).

***Вывад:*** Нягледзячы на «малады» ўзрост, Узгорскі замак, які ўзнік на месцы пасялення Х ст. (Г. Штыхаў), адыграў значную ролю у гістарычным развіцці Віцебска, завяршэнні фарміравання цэнтральнай часткі горада як адміністрацыйнай, гандлёвай і культурнай структуры.

Для замацавання матэрыялу прапануецца падрыхтаваць даклады, рэфераты і паведамленні аб канкрэтных архітэктурных помніках і

Репозиторий ВГУ

гістарычных падзеях, звязаных з Узгорскім замкам (аб Васкрасенскай (Рыначнай) царкве, Успенскім саборы, Ратушы, паўстанні 1623 г., Магдэбургскім праве ў Віцебску і інш.).

## УРОК

ТЭМА: **Узгорскі замак**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з апошнім, самым «маладым» па ўзросце замкам Віцебска – Узгорскім, раскрыць яго ролю і значэнне ў жыцці сярэдневяковага і позне-сярэдневяковага Віцебска і ў больш позні час, пазнаёміць з такімі цікавейшымі помнікамі віцебскай архітэктуры, як Васкрасенская (Рыначная) царква, Ратуша, Базыльянскі кляштар, а потым Успенскі сабор, Іезуіцкі калегіум і інш.; зрабіць некалькі паведамленняў аб развіцці тэрыторыі Узгорскага замка ў XIX–XX стст.

***Абсталяванне:*** ксеракопіі з малюнкаў з кніг, якія маюць адносіны да Узгорскага замка, «Чарцёж Віцебска 1664 г.», эцюды І.Я. Рэпіна да карціны «Забойства Іасафата Кунцэвіча», трагедыя У. Караткевіча «Званы Віцебска», каралеўская грамата аб наданні Віцебску Магдэбургскага права, наборы паштовак XIX ст. аб Узгорскім замку, фотаздымкі археалагічных знаходак з Узгорскага замка (або перасоўная экспазіцыя гэтых знаходак з абласнога краязнаўчага музея). Выстава кніг і літаратуры, якая можа быць выкарыстана пры напісанні навучэнцамі рэфератаў і паведамленняў аб Узгорскім замку Віцебска.

### Ход урока

I. Арганізацыйны момант.
II. Мэтавая ўстаноўка.
III. Тлумачэнні настаўніка.

***План вывучэння навага матэрыялу***

1. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця Узгорскага замка, яго станаўленне ў XVII – першай палове XVIII ст.
2. Узгорскі замак – своеасаблівы культурна-рэлігійны цэнтр позне-сярэдневяковага Віцебска.
3. Абарончыя збудаванні Узгорскага замка.
4. Характарыстыка архітэктурных збудаванняў, спалучэнне розных архітэктурных стыляў. Віленскае барока.
5. З гісторыі Магдэбургскага права ў Віцебску.
6. Паўстанне 1623 г., яго трагічныя вынікі. Адлюстраванне тых падзей у літаратуры і мастацтве.
7. Развіццё і забудова Узгорскага замка ў XIX–XX стст.



Репозиторий ВГУ

8. Значэнне Узгорскага замка для культурна-гістарычнага развіцця г. Віцебска.

**Пытанні для замацавання**

1. Калі ўзнік і як складваўся Узгорскі замак?
2. Гістарычны лёс замка, развіццё яго тэрыторыі ў XIX–XX стст.
3. Назавіце і ахарактарызуйце найбольш знакамітыя архітэктурныя помнікі Узгорскага замка?
4. Што Вам вядома аб гарадской ратушы?
5. Што дало Віцебску наданне Магдэбургскага права?
6. У чым адметнасць Васкрасенскай (Рыначнай) царквы?
7. Што можна сказаць аб дзейнасці Іезуіцкага калегіума ў Віцебску?
8. Ахарактарызуйце развіццё гандлю ў Віцебску ў XVII–XVIII стст.
9. Хто такі І. Кунцэвіч? Што можна сказаць аб яго дзейнасці?
10. Чым закончылася паўстанне гараджан у 1623 г.?
11. Успенскі сабор у Віцебску: што можна сказаць пра яго гісторыю?
12. У чым адметнасць грамадзянскай забудовы на тэрыторыі Узгорскага замка?
13. Што Вам вядома пра губернатарскі палац і помнік героям Айчыннай вайны 1812 г.?
14. Чым характэрны ў архітэктуры стыль «віленскае барока»?
15. Чым вядомы ў віцебскай архітэктуры І. Фамін?
16. У чым значэнне Узгорскага замка для культурна-гістарычнага развіцця г. Віцебска?

***Вывад:*** Узгорскі замак як культурна-гістарычны цэнтр Віцебска мае больш кароткую гісторыю, чым Ніжні і Верхні замкі, але яго роля ў жыцці горада вельмі значная. Менавіта, з гэтай часткай горада звязаны такія гістарычныя падзеі, як наданне Віцебску Магдэбургскага права, паўстанне віцяблян супраць уніяцкага засілля ў 1623 г., Айчынная вайна 1812 г. і інш. і помнікі, як Васкрасенская (Рыначная), гарадская ратуша, Успенскі сабор, губернатарскі палац і інш. Па сутнасці Узгорскі замак завяршыў фарміраванне культурна-гістарычнага ядра позднe-сярэдневяковага Віцебска.

IV. Дамашняе заданне (адзін з варыянтаў – падрыхтаваць сіламі навучэнцаў драматычныя сцэны па п’есе У. Караткевіча «Званы Віцебска»).

Репозиторий ВГУ

# V. ЭКСКУРСІЯ ПА ЗАДЗВІННІ

ТЭМА: **Задзвінне, яго месца і роля у развіцці Віцебска ў канцы XVIII – XX ст.**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з такім самабытным раёнам Віцебска, як Задзвінне, які атрымаў сваё развіццё з канца XVIII ст., раскрыць этапы яго станаўлення, пазнаёміць з помнікамі архітэктуры, як мінулых гадоў, так і сённяшнімі, паказаць значэнне гэтай часткі горада для сучаснага развіцця.

***Літаратура***


1. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск, 1988.
2. Кішык, Ю.Н. Панарама старажытнага Віцебска / Ю.Н. Кішык. – Мінск, 1995.
3. Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1984.
4. Літаратура і мастацтва Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1984. – Т. 1.
5. Подлипский, А. Васильковые годы Марка Шагала / А. Подлипский. – Витебск, 1997.
6. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.
7. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.
8. Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска / Т.І. Чарняўская. – Мінск, 1980.
9. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск, 1978.


***Заданне:*** Знайсці і выпісаць з літаратуры ўсё, што мае адносіны да Задзвінскага раёна г. Віцебска, зрабіць ксеракопіі з малюнкаў у гістарычнай і краязнаўчай літаратуры, што маюць адносіны да гэтага раёна Віцебска, наведаць помнікі архітэктуры канца XVIII – XX ст., а менавіта, касцёл св. Варвары, былыя саляныя склады, а цяпер Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне», дом-музей М. Шагала, будынак чыгуначнага вакзала, пазнаёміцца з матэрыяламі аб Віцебскім гета. Сфармуляваць і запісаць тры–пяць самых значных і цікавых пытанняў па гісторыі Задзвіння.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Часовыя параметры ў фарміраванні Задзвіння. Колькі слоў пра паселішча Русь (пасад Рускі).
2. Найбольш значныя архітэктурныя пабудовы (ад царквы Сімяона Столпніка да музея М. Шагала).
3. З гісторыі касцёла Св. Варвары.
4. Забудова Задзвіння ў другой палове XIX ст.

Репозиторий ВГУ

5. Чым вядома Юр’ева горка?

6. Старэйшыя ў Віцебску Сямёнаўскія могілкі.

7. З гісторыі заводаў Задзвіння.

8. Чыгуначны вакзал як помнік грамадзянскай архітэктуры другой паловы XIX ст.

9. Адроджаны музей М. Шагала.

10. «Саляныя склады» – «Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне».

11. Колькі слоў пра яўрэйскае гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

12. Значэнне Задзвіння для развіцця сучаснага Віцебска.

***Вывад:*** Раён Задзвіння як частка гарадской структуры атрымаў сваё развіццё ў больш познія, чым іншыя часткі горада, часы (з канца XVIII ст.). Ён больш бедны на значныя архітэктурныя пабудовы. Але на сённяшні дзень – гэта значны і ў эканамічных, і ў культурных адносінах раён і яго значэнне, як «варот» Віцебска пастаянна расце.

Для замацавання матэрыялу прапануецца падрыхтаваць даклады, рэфераты і паведамленні аб канкрэтных архітэктурных помніках мінулага і сённяшняга дня, аб эканамічнай дзейнасці Віцебска, чыгункі, заводаў і прадпрыемстваў Чыгуначнага раёна.

Можна падрыхтаваць літаратурную кампазіцыю па вершах М. Шагала.

## УРОК

### ТЭМА: **Задзвінне**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з такім самабытным раёнам горада, як Задзвінне, які атрымаў сваё развіццё ў больш познія часы, чым цэнтральная частка Віцебска, ахарактарызаваць помнікі мінулага і сучаснага на тэрыторыі Задзвіння, больш дэталёва азнаёміць з творчасцю М. Шагала, падкрэсліць значэнне Задзвіння для эканамічнага і культурнага развіцця сучаснага Віцебска.

***Абсталяванне:*** ксеракопіі з малюнкаў з кніг, якія маюць адносіны да Задзвіння, «Чарцёж Віцебска 1664 года», наборы паштовак аб Віцебску XIX – пачатку XX ст., паштоўкі з відамі сучасных забудоў. Выстава кніг і літаратуры, якая можа быць выкарыстана пры напісанні навучэнцамі рэфератаў і паведамленняў аб Задзвінні, а таксама аб жыцці і творчасці М. Шагала.

### Ход урока

I. Арганізацыйны момант.

II. Мэтавая ўстаноўка.

III. Тлумачэнні настаўніка.

Репозиторий ВГУ

***План вывучэння навага матэрыялу***

1. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця Задзвіння. Слабадскі пасад і паселішча Русь (Пасад Рускі). Складванне Задзвіння ў асобны Чыгуначны раён г. Віцебска.

2. Характарыстыка найбольш знакамітых архітэктурных помнікаў Задзвіння.

3. Музей М. Шагала як адна з сучасных знакамітасцей Задзвіння.

4. Задзвінне – сенняшнія «вароты» Віцебска.

5. Рэстаўрацыя «саляных складоў» у «Цэнтр народных рамёстваў і матацтваў «Задзвінне» – выдатны прыклад эфектыўнага выкарыстання архітэктурнай спадчыны.

6. Значэнне Задзвіння для развіцця сучаснага Віцебска.

**Пытанні для замацавання**

1. Калі ўпершыню ў гісторыі Віцебска ўпамінаецца Задзвінская слабада?

2. Як ішло развіццё Задзвіння ў XVIII – першай палове XIX ст.?

3. Што можна распавядаць пра касцёл Св. Варвары?

4. Чым вядомы «саляныя склады»?

5. Калі і дзе ў Задзвінні дзейнічала «батальонная церковь»?

6. Калі быў пабудаваны Кіраўскі мост?

7. Што Вы ведаеце пра Юр'еву горку?

8. Калі ўзніклі і чым адметны Сямёнаўскія могілкі?

9. Ахарактарызуйце развіццё Задзвіння ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

10. Чым вядома Пакроўская вуліца?

11. Што можна распавядаць пра М. Шагала?

12. Развіццё Задзвінскай часткі горада (Чыгуначнага раёна) у савецкі і постсавецкі час.

13. Што Вам вядома пра будынак чыгуначнага вакзала?

14. У чым значэнне былога Задзвіння – Чыгуначнага раёна для эканамічнага і культурнага развіцця сучаснага Віцебска?

***Вывад:*** Задзвінне – раён г. Віцебска на правым беразе р. Заходняя Дзвіна, які ўзнік у больш позні\я часы (кан. XVIII ст.), але таксама атрымаў значнае развіццё (асабліва ў другой палове XIX ст.). Ён менш багаты на архітэктурныя помнікі, чым цэнтральная частка горада (касцёл Св. Варвары, «саляныя склады», Сямёнаўскія могілкі, будынак чыгуначнага вакзала, музей М. Шагала). Задзвінская слабада, а цяпер Чыгуначны раён – гэта, па сутнасці, сучасныя «вароты» г. Віцебска. Ён адыгрывае значную ролю ў эканамічным і культурным развіцці сучаснага горада.

IV. Дамашняе заданне: (адзін з варыянтаў – падрыхтаваць сіламі навучэнцаў літаратурна-мастацкую кампазіцыю па творах М. Шагала).



Репозиторий ВГУ

# VI. ЭКСКУРСІЯ «ПА ВАКОЛІЦАХ ВІЦЕБСКА»

## ТЭМА: **Знакамітыя ваколіцы г. Віцебска і іх значэнне для культурна-гістарычнага развіцця горада**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў са знакамітымі мясцінамі (як увайшоўшымі ў сучасны горад, так і размешчанымі па-за гарадской тэрыторыяй), якія адыгралі значную ролю ў культурна-гістарычным развіцці Віцебска – гарадзішчы Баронікі (каля в. Баронікі) як помнік днепра-дзвінскай археалагічнай культуры (і, магчыма, протагорад Віцебска, па Г.В. Штыхаву), і Лужасна (каля в. Лужасна Віцебскага раёна), Маркаў манастыр (цяпер Маркаўшчына), Лукішскі замак (на Лучосе), в. Мазалава (былая сядзіба «Мілае», дзе жыў пісьменнік І. Манькоўскі) і в. Здраўнёва (былая сядзіба І.Я. Рэпіна).

### *Літаратура*

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1993.
2. Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX стст. – Віцебск, 1995.
3. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск, 1988.
4. Газін, Дз. Мазалаўская «Швейцарыя» / Дз. Газін. – Віцебск, 1992.
5. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. – Мінск, 1989. – Т. 3.
6. Кішык, Ю.Н. Панарама старажытнага Віцебска / Ю.Н. Кішык. – Мінск, 1995.
7. Літаратура і мастацтва Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1984. – Т. 1.
8. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 1995.
9. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий. – Минск, 2001.
10. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1; Сапунов, А.П. Река Западная Двина. Историко-географический обзор / А.П. Сапунов. – Витебск, 1893.
11. Святотроицкий Марков монастырь в г. Витебске. – СПб., 1911.
12. Штыхов, Г.В. Сравнительное изучение древнейших городов Полоцкой земли и памятников их окрестностей / Г.В. Штыхов // У кн.: Древности Белоруссии. – Минск, 1966; Штыхов, Г.В. Работы Полоцко-Витебского отряда / Г.В. Штыхов // В кн.: Археологические открытия 1974. – М., 1975.

***Заданне:*** Знайсці і выпісаць з літаратуры ўсё, што мае адносіны да азначаных мясцін, зрабіць ксеракопіі будынкаў Маркава манастыра з кнігі «Живописная Россия», наведаць царкву, што на Маркаўшчыне (адну, якая засталася ад усяго манастырскага комплексу, пазнаёміцца з жыццём і творчасцю І. Манькоўскага, пазнаёміцца з карцінамі і эцюдамі да карцін,

зробленых І.Я. Рэпіным у Здраўнёве. Сфармуляваць і запісаць тры–пяць самых значных і цікавых пытанняў па азначанай тэме.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Гарадзішчы Баронікі і Лужасна як помнікі археалогіі ў ваколіцах Віцебска.

2. Маркаў манастыр – адзін з цікавейшых культурна-гістарычных і архітэктурных комплексаў Беларусі. Гісторыя стварэння і існавання.

3. Лукішкі – цікавая, але згубленая для культуры горада пабудова.

4. Мазалава (Мілае) – месца жыцця і творчасці пісьменніка І. Манькоўскага.

5. І. Манькоўскі – адзін з першых аўтараў твораў аб Айчыннай вайне 1812 г.

6. Жыццядзейнасць І.Я. Рэпіна на Віцебшчыне:

– гісторыя в. Сафіёўка;

– водгукі І.Я. Рэпіна аб Сафіёўцы;

– жыццё сям'і Рэпіных у Здраўнёве;

– творчая дзейнасць І.Я. Рэпіна ў Здраўнёве;

– сучасны стан Здраўнёва. Поўнае аднаўленне сядзібы. Па магчымасці зрабіць мэтавую экскурсію ў «Музей-сядзібу Іллі Рэпіна «Здраўнёва».

7. Роля і месца азначаных мясцін у культурна-гістарычным развіцці Віцебска.

***Вывад:*** Размешчаныя ў ваколіцах Віцебска культурна-гістарычныя комплексы (асабліва такія, як Маркаў манастыр, Здраўнёва і інш.) адыгралі значную ролю ў захаванні і развіцці духоўнасці віцяблян, ва ўмацаванні іх сувязі з рускай мастацкай культурай.

Для замацавання матэрыялу прапануецца падрыхтаваць даклады, рэфераты і паведамленні аб кожным з азначаных у тэме культурных аб'ектаў, а таксама аб жыцці і творчасці такіх аўтараў, як І. Манькоўскі і І. Рэпін, выкарыстаўшы іх творы і пісьмы.

## УРОК

### ТЭМА: **Па ваколіцах Віцебска**

***Мэта:*** азнаёміць навучэнцаў з такімі адметнымі культурна-гістарычнымі і археалагічнымі помнікамі (Баронікі, Лужасна) і цэнтрамі, як Маркаў манастыр, Лукішкі, Мазалава, Здраўнёва, раскрыць іх ролю ў захаванні духоўна-культурнага патэнцыялу Віцебшчыны, ва ўмацаванні сувязей з рускай мастацкай культурай.



Репозиторий ВГУ

***Абсталяванне:*** ксеракопіі з кніг, у якіх змешчаны малюнкі і відарысы Маркава манастыра, Лукішак, Здраўнёва, Мазалава (напрыклад, з «Живописной России»), урыўкі з твораў І. Манькоўскага, пісьмы І.Я. Рэпіна са Здраўнёва сваім знаёмым, рэпрадукцыі карцін і эцюдаў, створаных І.Я. Рэпіным у Здраўнёве. Матэрыялы перыядычнага друку аб адкрыцці рэстаўрыраванага «Здраўнёва» ў чэрвені 2000 г.

**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант.
II. Мэтавая ўстаноўка.
III. Тлумачэнні настаўніка.

***План вывучэння навага матэрыялу***

1. Даць аглядную характарыстыку археалагічных помнікаў, культурна-гістарычных мясцін, размешчаных у ваколіцах Віцебска.

2. Распавядаць пра археалагічныя гарадзішчы Баронікі і Лужасна, Маркаў манастыр, выдзеліўшы асабліва Троіцкую царкву як выдатны помнік беларускага дойлідства і цікавы прыклад сінтэзу архітэктуры і выяўленчага мастацтва.

3. Падкрэсліць ролю Маркава манастыра як змагара за захаванне праваслаўя ў Віцебску ў гады ўніяцкага засілля.

4. Мазалава (Мілае) як адзін з культурных цэнтраў пад Віцебскам у 20-я гады XIX ст.

5. Ігнацій Манькоўскі – адзін з першых пісьменнікаў Віцебшчыны.

6. Сафіёўка (Здраўнева) і І.Я. Рэпін (пісьмы Рэпіна са Здраўнёва, яго творчая дзейнасць пад Віцебскам). Лёс Здраўнёва.

7. Правесці сустрэчу з вядомым краязнаўцам ваколіц г. Віцебска і Віцебскага раёна Дз. Газіным.

8. Значэнне азначаных культурна-гістарычных цэнтраў для захавання і развіцця мастацкай культуры Віцебшчыны.

**Пытанні для замацавання**

1. Якія археалагічныя помнікі вядомы ў ваколіцах Віцебска?
2. Што Вам вядома пра Маркаў манастыр?
3. Чым цікавая манастырская Троіцкая царква?
4. У чым заключаецца культурна-гістарычнае значэнне Маркава манастыра?
5. Чым цікавыя «Лукішкі» на Лучосе?
6. Хто такі І. Манькоўскі?
7. Чым вядома Мазалава (Мілае)?
8. Што Вам вядома пра в. Сафіёўка, пад Рубай?
9. Калі ў Сафіёўцы пасяліўся І.Я. Рэпін?

Репозиторий ВГУ

10. Што пісаў пра Сафіёўку (Здраўнёва) і яе жыхароў І.Я. Рэпін у сваіх пісьмах?

11. Якія творы напісаў І. Рэпін у Здраўнёве?

12. Якім быў лёс Здраўнёва?

13. Што Вам вядома пра сённяшняе Здраўнёва?

14. Якая роля азначаных культурна-гістарычных цэнтраў для развіцця духоўнасці і мастацкай культуры на Віцебшчыне?

***Вывад:*** археалагічныя помнікі (гарадзішчы Баронікі і Лужасна) і культурна-гістарычныя цэнтры ў ваколіцах Віцебска (такія, як Маркаў манастыр, Здраўнёва і інш.) адыгралі значную ролю ў развіцці і захаванні духоўнасці беларускага народа, яго мастацкай культуры, а таксама ва ўмацаванні сувязей беларускага мастацтва з рускай мастацкай культурай.

IV. Дамашняе заданне (адзін з варыянтаў – падрыхтаваць сіламі навучэнцаў літаратурна-мастацкі мантаж па пісьмах і творах І.Я. Рэпіна, напісаных і створаных у Здраўнёве).

Репозиторий ВГУ

# VII. ЭКСКУРСІЯ «МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ДОШКІ НА БУДЫНКАХ Г. ВІЦЕБСКА»

***Мэта:*** пазнаёміць навучэнцаў з прозвішчамі гістарычных асоб, дзеячаў навукі, сусветнай, расійскай і беларускай мастацкай культуры, удзельнікаў барацьбы за вызваленне і развіццё г. Віцебска ў розныя гістарычныя эпохі, асобамі, якія вызначыліся ў пасляваенным эканамічным і культурным развіцці горада і ў гонар якіх у Віцебску ўсталяваны мемарыяльныя дошкі. Гэта адзін з вядучых метадаў спалучыць гісторыю і сучаснасць, паказаць удзельнікам экскурсіі неразрыўнасць працэсу «мінулае–сённяшняе–будучае», далучыць іх да разумення гэтай дыялектыкі. Тым больш, што такія матэрыялы і сёння вельмі рэдкія ў сетцы Internet.

***Методыка:*** настаўнік (выкладчык), які мае ўсе звесткі аб усталяваных у г. Віцебску мемарыяльных дошках у гонар знакамітых асоб (лепш за ўсё мець фотаздымкі будынкаў, на якіх размешчаны мемарыяльныя дошкі, а таксама біяграфічныя дадзеныя аб тых асобах, у гонар якіх яны ўсталяваны), распрацоўвае найбольш цікавы экскурсійны маршрут і знаёміць з ім будучых экскурсантаў. Маршруты могуць быць як больш кароткія па адлегласці і часу, які адводзіцца на экскурсію, так і больш працяглыя. Прыкладам аднаго з такіх маршрутаў можа стаць экскурсія па вуліцы імя Суворава. Па адлегласці ён не вельмі працяглы – усяго каля 2 кіламетраў (ад перасячэння вуліцы імя Суворава з вуліцай імя Талстога – будынак «Аграпромбанка» – да пачатку вуліцы імя Кутузава – будынак былой мужчынскай духоўнай семінарыі, цяпер тут размешчаны педагагічны факультэт УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»). А вось па часе… Тут на наш погляд, усё залежыць ад майстэрства экскурсавода – вельмі багаты гэта маршрут на мемарыяльныя дошкі.

Але – па парадку. Мы прапануем пачынаць экскурсію ад будынка «Аграпромбанка», на якім знаходзяцца мемарыяльныя дошкі ў гонар вядомых даследчыкаў мастацкай культуры Віцебшчыны В.Г. Красьнянскага (1863–1930) і Н.Я. Нікіфароўскага (1845–1910), затым, абмінаючы адноўленую Васкрасенскую (Рыначную) царкву – яна можа быць аб’ектам спецыяльнай экскурсіі – экскурсійная група зробіць першы прыпынак каля будынка Віцебскай ратушы помніка архітэктуры XVIII ст. (цяпер Віцебскі абласны краязнаўчы музей). Перад будынкам музея знаходзіцца мемарыяльны знак у памяць аб савецкіх патрыётах, закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941–1944 гг. І тут павінна адбыцца размова аб тым трагічным часе. Наступны аб’ект экскурсіі – будынак Віцебскай мастацкай школы № 1 (вуліца імя Суворава, 3) на якім знаходзіцца аж 5 мемарыяльных дошак (дарэчы, для тых навучэнцаў, якія

Рэпазіторый ВДУ

больш глыбока цікавяцца роляй Віцебска ў развіцці беларускага выяўленчага мастацтва можа быць арганізавана спецыяльная экскурсія). Яны прысвечаны вядомым дзеячам беларускай мастацкай культуры – выпускнікам Віцебскага мастацкага тэхнікума – народнаму мастаку СССР, нашаму земляку Азгуру Заіру Ісакавічу (нарадзіўся ў в. Маўчаны Сенненскага раёна ў 1908 г. Памёр у 1995 г.), народнаму архітэктару СССР Кагалю Уладзіміру Іванавічу (1912–1980), народным мастакам БССР Бембелю Андрэю Ануфрыевічу (1905–…) і Селіханаву Сяргею Іванавічу (1917–1976). На мемарыяльнай дошцы ў гонар народнага пісьменніка БССР, лаўрэата Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай працы можна прачытаць, што менавіта ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме В. Быкаў навучаўся ў 1939–1940 гг.

Далей маршрут экскурсіі будзе не менш цікавым, чым у яе пачатку. І з правага, і з левага бакоў вуліцы перад вачамі экскурсантаў будуць будынкі з дзяржаўным знакам «гісторыка-культурная каштоўнасць: забудова вуліцы Суворава XIX–XX стагоддзяў. Ахоўваецца дзяржавай». Гэта будынкі пад нумарамі 3, 6, 7, 8, 9, 10, 17, 18, 20, 21, 34, 38. Дарэчы, два цікавыя архітэктурныя помнікі датуюцца – адзін канцом XVIII ст. (былы губернатарскі палац (цяпер будынак КДБ) – самы стары будынак у Віцебску), другі – канцом XIX стагоддзя (будынак былой Віцебскай мужчынскай духоўнай семінарыі).

Але вернемся да тэмы. Вуліца імя Суворава, 21 – дошка ў гонар народнага артыста СССР і БССР Ільінскага Аляксандра Канстацінавіча (1903–1967), імя Суворава, 25 – дошка ў гонар народнага артыста БССР Сяргейчыка Цімафея Мікалаевіча (1988–1977). А калі на перасячэнні вуліц імя Суворава і імя Урыцкага завярнуць на 25–30 м направа, то на доме па вуліцы імя Урыцкага, 19 можна пазнаёміцца з дошкай у гонар народнай артысткі БССР, ураджэнкі Віцебшчыны Канапелькі Зінаіды Ігнацьеўны (нарадзілася ў г.п. Багушэўск у 1918 г. Памёрла ў 1997 г.). Заўважым, што па ходзе экскурсіі можна пазнаёміцца з жыццём і педагагічнай дзейнасцю выдатнага віцебскага педагога Самойлавай, імя якой прысвоена яслям-саду па вуліцы імя Суворава. Калі экскурсія дасягае перасячэння вуліц імя Суворава і Савецкай, абавязкова патрэбна звярнуць на Успенскую горку – адно з найбольш знакамітых месцаў Віцебска. Дарэчы, наведаванне Успенскай горкі можа быць тэмай спецыяльнай экскурсіі.

І яшчэ адна асаблівасць гэтага экскурсійнага маршрута. Гэта насычанасць яго скульптурнымі помнікамі (у горадзе такога, бадай што, не ўбачым). Тут помнікі Сувораву, героям Айчыннай вайны 1812 года, мемарыяльная захаванне загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. Сярод іншых і магіла легендарнага «бацькі Міная», Героя Савецкага Саюза Шмырова Міная Фёдаравіча), помнік вучонаму-музыказнаўцу Салярцінскаму Івану Іванавічу, мемарыяльны мастацкі знак у гонар сусветнай знакамітасці мастака Марка Шагала,

Рэпазіторый ВДУ

нарэшце, помнік віцебска-беларускай знакамітасці паэту, празаіку, драматургу, публіцысту Караткевічу Уладзіміру Сямёнавічу.

Вось так нечакана амаль што атрымалася цэлая экскурсія. Але на самой справе – гэта толькі падказка для арганізатараў. Яны самі вызначаюць, як і ў якім моманце расставіць акцэнты, як улічыць інтарэсы навучэнцаў, чым іх зацікавіць і г.д.

Зыходзячы з адзначанага, можна прапанаваць навучэнцам напісаць рэфераты (або зрабіць навуковыя даклады ці паведамленні) на тэмы:

– «Вуліца імя Суворава – захавальніца і носьбіт ведаў аб мастацкім (і гістарычным) жыцці горада ў XIX – пачатку XX ст.».

– «Героі мемарыяльных дошак і іх месца ў нацыяльнай мастацкай культуры».

– «Каралі архітэктуры! Але ж іх творчы шлях пачынаўся ў Віцебску».

– «За што мне падабаецца вуліца імя Суворава» і інш.

Можна прапанаваць навучэнцам і такое заданне: «А як бы я правёў экскурсію па вуліцы імя Суворава?».

Канечне, правесці такое мерапрыемства не проста. Але ж нехта павінен будзіць нацыянальную свядомасць і, як пісаў У. Караткевіч, «біць у той пакараны віцебскі звон» (чытай трагедыю «Званы Віцебска»), каб непераходзячае багацце нашай даўніны, усё тое, што для кожнага і ёсць свая «малая Радзіма», назаўсёды засталося ў сэрцы чалавека.

**План правядзення экскурсіі:**

1. Кароткія гісторыі забудовы вуліцы імя Суворава

2. Галоўныя архітэктурныя знакамітасці вуліцы імя Суворава.

Кароткія гісторыі Віцебскага мастацкага тэхнікума (цяпер мастацкая школа № 1). Можна сустрэцца з кіраўніцтвам вучылішча.

4. В.Г. Краснянскі і Н.Я. Нікіфароўскі – выдатныя даследчыкі гісторыі культуры і этнаграфіі Віцебшчыны.

5. Наш зямляк, выдатны беларускі савецкі скульптар, Герой Сацыялістычнай Працы, народны мастак СССР З.І. Азгур.

6. Выдатны беларускі савецкі скульптар, народны мастак БССР А.А. Бембель.

7. Выдатны беларускі савецкі архітэктар, народный архітэктар СССР У.А. Кароль.

8. Выдатны беларускі савецкі скульптар, народны мастак БССР С.І. Селіханаў.

9. Выдатны беларускі савецкі акцёр, народны артыст СССР, народны артыст БССР А.К. Ільінскі

10. Выдатны беларускі савецкі акцёр, народны артыст БССР Ц.М. Сяргейчык.

11. Наша зямлячка, выдатная беларуская актрыса, народная артыстка БССР З.І. Канапелька.

Рэпазіторый ВДУ

12. «Быў. Ёсць. Буду». Менавіта такі надпіс занатаваны на помніку У. Караткевічу. Адкажам на пытанне: «Чаму?».

Няпоўныя два кіламетры экскурсійнага марштура. Але якімі багатымі з'яўляюцца яны для абагачэння памяці навучэнцаў фактамі і цікавымі прыкладамі з гісторыі роднага Віцебска і яго мастацкай культуры.

***Вывад:*** прыведзены адзін (прыкладны) экскурсійны маршрут (але кожны з выкладчыкаў можа скласці свой асабісты, той, які зацікавіць навучэнцаў). На наш погляд, ён найбольш багаты на гісторыка-культурныя звесткі аб культурным жыцці Віцебска ў розныя гістарычныя эпохі. Канечне, ад арганізатараў экскурсіі ён запатрабуе напружанай працы па яе падрыхтоўцы і атрымання станоўчага выніку. Патрэбна абнавіць свае веды па гісторыі Віцебска, яго архітэктуры, жыццядзейнасці тых дзеячаў, з мемарыяльнымі дошкамі ў гонар якіх давядзецца пазнаёміцца пры правядзенні экскурсіі. Вынік экскурсіі – урок-дыспут, урок-віктарына, нават навуковая канферэнцыя, але ўсё гэта павінна быць скіравана на тое, каб і настаўнік (выкладчык)*, і навучэнцы атрымалі задавальненне ад праведзенага мерапрыемства.

Урок-дыспут, напрыклад, можа быць арганізаваны, як вольны ўдзел навучэнцаў у дыскусіі па самай агульнай тэме экскурсіі: «Што для мяне было новага ў экскурсійным маршруце?», але і з больш канкрэтнымі пытаннямі. Скажам, такімі: «Вам будзе прапанавана правесці экскурсію па вуліцы імя Суворава. Што для гэтага вы павінны зрабіць?» і інш. Дарэчы, настаўнікам (выкладчыкам) можа быць прапанавана і іншая тэма. Але галоўнае – скіраваць дыспут у такім накірунку, каб у ім прынялі ўдзел як мага больш навучэнцаў. Вынікі ўрока-дыспута настаўнік (выкладчык) падводзіць у сваім кароткім заключным слове.

Пытанні да ўрока-віктарыны рэкамендуецца распрацаваць самому настаўніку (выкладчыку), а вось прыкладныя тэмы дакладаў і паведамленняў для навуковай канферэнцыі, на наш погляд, маглі б быць наступнымі (канферэнцыю ўступным словам адкрывае настаўнік (выкладчык), ён жа вызначае парадак работы. Маецца на ўвазе, што канферэнцыя можа пачынацца з самастойнага, больш агульнага даклада, а іншыя паведамленні будуць развіццём думак гэтага даклада. А можа быць і так: агульны агляд зробіць настаўнік (выкладчык), а даклады навучэнцаў будуць прысвечаны розным накірункам. Але з тым разлікам, што ў рэшце рэшт атрымаецца комплексны аналіз вуліцы імя Суворава з усімі яе мастацка-гістарычнымі каштоўнасцямі).

Але вернемся да прыкладных тэм навучэнскіх дакладаў:

– «Вуліца імя Суворава – адзін з цікавейшых гісторыка-архітэктурных ансамбляў сучаснага Віцебска».
– «Будынак былога губернатарскага палаца і будынак былой мужчынскай

* Маецца на ўвазе выкладчык сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай навучальнай установы.



Репозиторий ВГУ

духоўнай семінарыі – сведкі фарміравання Віцебскай архітэктурнай школы канца XVIII – XIX ст.».
– «Віцебскі мастацкі тэхнікум (мастацкае вучылішча) – калыска беларускага савецкага выяўленчага мастацтва».
– «Яны былі зоркамі беларускага савецкага тэатральнага мастацтва».
– «Мемарыяльны комплекс на Успенскай горцы: гісторыя стварэння і яго роля ў сучасным жыцці Віцебска».
– «Помнікі вуліцы імя Суворава».
– «Трагедыя У. Караткевіча «Званы Віцебска» – сведка барацьбы гараджан за сваю незалежнасць».

Канечне, могуць быць выбраны і іншыя тэмы – усё залежыць ад таго накірунку канферэнцыі, які будзе найбольш карысным і цікавым і для навучэнцаў, і для настаўніка (выкладчыка) – арганізатара экскурсіі.

**Ход урока**

1. Арганізацыйны момант.
2. Мэтавая ўстаноўка (у залежнасці ад абранай формы ўрока).
3. Правядзенне віктарыны, дыспута або навуковай канферэнцыі.
4. Падвядзенне вынікаў урока (могуць удзельнічаць і навукоўцы, якія былі на экскурсіі).
5. Аналіз вынікаў урока. Дамашняе заданне.

***Літаратура***

1. Гаробчанка, Т.Я. Зінаіда Канапелька. Нарыс жыцця і творчасці / Т.Я. Гаробчанка. – Мінск, 1999.
2. Кішык, Ю.М. Панарама старога Віцебска / Ю.М. Кішык. – Мінск, 1995.
3. Мяснікоў, А. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А. Мяснікоў. – Мінск, 2008.
4. Няфёд, І.У. Беларускі тэатр імя Якуба Коласа / І.У. Няфёд. – Мінск, 1976.
5. Орлова, М. Андрей Онуфриевич Бембель / М. Орлова. – М., 1958.
6. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч. Праз гісторыю ў сучаснасць / А. Русецкі. – Мінск, 2000.
7. Русецкий, А.В. Художественная культура Вицебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. – Минск, 2001.
8. Русецкий, А.В. Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. – Витебск, 2011.
9. Скібнеўскі, А.Б. Народны артыст СССР А.К. Ільінскі / А.Б. Скібнеўскі. – Мінск, 1973.
10. Сяргейчык, Ц. Нататкі акцёра. Шлях жыцця і творчасці / Ц. Сяргейчык. – Мінск, 1973.
11. Чарняўская, Т.І. Архітэктура Віцебска / Т.І. Чарняўская. – Мінск, 1980.

Репозиторий ВГУ

12. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984. – Т. 1; Мінск, 1985. – Т. 2; Мінск, 1978. – Т. 4–5.
13. Газетныя артыкулы:
– Сергеенко, Н. Полоцкий проект Владимира Короля / Н. Сергеенко // Полацкі веснік. – 2008. – 1 красав.; Сергеенко, Н. Каменная летопись города / Н. Сергеенко // Полацкі веснік. – 2007. – 23 кастр.; Лапо, А. Архітэктар з сімвалічным прозвішчам Кароль / А. Лапо // Народнае слова. – 1997. – 18 снеж.

Добрым дапаўненнем для пазнання гісторыі Віцебска і яго мастацкай культуры, на наш погляд, стануць самыя розныя экскурсійныя маршруты, якія распрацоўваюцца настаўнікам (выкладчыкам) гісторыі ў навучальных установах усіх тыпаў (агульнаадукацыйная школа, гімназія, каледж, тэхнікум, ВНУ). Зробім агаворку і адзначым, што нашы прапановы павінны разглядацца як рэкамендацыйныя. Ініцыятыва ж заўсёды ў руках арганізатара мерапрыемства. Настаўнік (выкладчык) заўсёды можа і павінен шукаць новыя і новыя ідэі. У гэтым і ёсць яго інавацыйныя падыходы да выкладання і вывучэння гісторыка-мастацкай спадчыны старажытнага Віцебска.

Репозиторий ВГУ

# VIII. ЭКСУРСІЯ «ГАРАДСКІЯ ВУЛІЦЫ НОСЯЦЬ ІХ ІМЯ»

Патрабаваннямі да настаўніка (выкладчыка) пры рабоце над гэтай тэмай, на наш погляд, могуць быць:

па-першае, ён павінен мець пералік усіх вуліц г. Віцебска, якія носяць прозвішчы знакамітых асоб. Праўда, іх не так ужо і шмат – усяго ледзь больш за 130 (зробім агаворку і адзначым, што і перавулкі пры новай забудове або губляюцца зусім, або атрымліваюць новую назву, сыходзячы з карты горада). Канечне, правільней было б мець «раскладку» па кожным з раёнаў – Кастрычніцкаму, Першамайскаму,Чыгуначнаму (у тым ліку, і па пасёлку Руба);

па-другое, «імянныя» вуліцы патрэбна згрупаваць у залежнасці ад адносін той ці іншай асобы да гістарычных падзей, развіцця сусветнай, расійскай ці беларускай мастацкай культуры, іх адносін да мінулага і сучаснага жыцця Віцебска.

Прыкладная разгрупоўка, на наш погляд, можа быць наступнай:

– гістарычныя асобы, дзекабрысты (Б. Хмяльніцкі, С. Разін, А. Сувораў, М. Кутузаў, І. Гарбачэўскі, М. Бястужаў-Румін);

– вучоныя-марксісты (К. Маркс, Ф. Энгельс, У. Ленін, А. Бебель, Ж. Жарэс, Р. Люксембург, Г. Дзімітраў);

– вядомыя савецкія і беларускія вучоныя (М. Ламаносаў, А. Сапуноў, акадэмік І. Паўлаў, І. Мічурын, С. Кавалёў, П. Сухі, М. Жукоўскі);

– асобы, чый лёс звязаны з Віцебскам (заўважым: Героі Савецкага Саюза, актыўныя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны будуць названы ў адпаведным пункце): А. Тувальскі, М. Бяліцкі, М. Макавец, А. Маўрын, С. Гурынаў (воіны-інтэрнацыяналісты), А. Шаўроў;

– вядомыя змагары за ўсталяванне Савецкай улады, героі грамадзянскай вайны (С. Вастрацоў, І. Бабушкін, М. Бауман, У. Азін, С. Будзённы, Р. Катоўскі, С. Лазо, М. Фрунзэ, В. Чапаеў, І. Шубін, М. Шчорс, В. Путна, камісар С. Крылоў, Ю. Гайдук);

– вядучыя дзяржаўныя дзеячы СССР і БССР (С. Арджанікідзэ, М. Калінін, В. Куйбышаў, С. Кіраў, Я. Свярдлоў, Ф. Дзяржынскі, А. Мяснікоў, І. Варэйкіс, М. Еўсцігнееў, В. Валадарскі, С. Урыцкі, У. Каралёў, В. Чунчын, А. Шчарбакоў);

– вядомыя людзі савецкай краіны (В. Чкалаў, Г. Байдукоў, М. Громаў, П. Асіпенка);

– вядомыя савецкія дыпламаты (П. Войкаў, Л. Красін, В. Вароўскі);

– Героі Савецкага Саюза, актыўныя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. (Я. Смушкевіч, А. Гаравец, І. Чарняхоўскі, І. Баграмян, М. Ватуцін, І. Люднікаў, А. Белабародаў, М. Шмыроў, Л. Даватар, К. Заслонаў, В. Харужая, С. Панкова, М. Гастэла, Е. Зянькова, М. Сільніцкі, І. Янушкоўскі, В. Свідзінскі, К. Шрадэр, А. Жасткоў, А. Матросаў,



Репозиторий ВГУ

В. Лявонаў, П. Кандрацьеў, Я. Іваноўскі, А. Данукалаў, М. Бірулін, І. Бумагін, А. Белахвосцікаў, Я. Берасцень, І. Сівакоў, У. Смятанін, Дз. Мясаедаў, Цімафей Рамашкін, Г. Грыгор'еў, В. Князеў, С. Супрун, К. Цалікаў, А. Даніленка, сям'я Свечкіных (Марфа, Іван, Анатолій, Вольга, Аляксандр – члены Віцебскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны), П. Сцепаненка, А. Сяроў, А. Вінаградава, А. Кальцоў);

– савецкія касманаўты (Ю. Гагарын, Г. Цітоў, В. Церашкова, П. Клімук, У. Кавалёнак);

– дзеячы расійскай мастацкай культуры (А. Герцэн, М. Глінка, М. Гогаль, В. Бялінскі, А. Грыбаедаў, М. Лермантаў, І. Лажэчнікаў, А. Пушкін, А. Някрасаў, І. Рэпін, мастак В. Стасаў, Л. Талстой, І. Тургенеў, П. Чайкоўскі, М. Чарнышэўскі, А. Чэхаў);

– дзеячы беларускай мастацкай культуры (Ф. Скарына, М. Багдановіч, М. Шагал, Я. Купала, Зм. Бядуля, Е. Лось, У. Караткевіч, А. Багатыроў, І. Ільінскі, сям'я Яроменкаў, А. Маўзон, П. Малчанаў, П. Броўка).

У горадзе маецца вуліца ў гонар польскага паэта А. Міцкевіча.

Можна лічыць (яшчэ раз падкрэслім!) нашу разгрупоўку прыкладнай. Але яна ўсё ж дазволіць настаўніку (выкладчыку) саарыентавацца пры выбары тэмы і формы правядзення экскурсіі. Можна прывесці некалькі прыкладных тэм:

– «Вуліцы імя Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцаў Віцебшчыны»;
– «Вуліцы імя герояў-партызан і падпольшчыкаў»;
– «Вуліцы імя выдатных савецкіх военачальнікаў»;
– «Вуліцы з жаночымі прозвішчамі»;
– «Яны жылі і працавалі ў Віцебску»;
– «Па прозвішчах літаратараў на вуліцах Віцебска можна вывучаць гісторыю беларускай літаратуры»;
– «З вялікай павагай да калег П. Клімука і У. Кавалёнка па касмічнаму цэху»;
– «Амаль уся расійская літаратурная класіка ў назвах віцебскіх вуліц» і інш.

Канечне, арганізацыя экскурсій па вызначанай тэме – справа не вельмі прыцягальная: вуліцы з прозвішчамі знакамітасцей раскіданы па ўсяму гораду. І вось тут узнікае праблема выбару формы правядзення экскурсіі. Можна правесці і выхад на мясцовасць, калі ў адным месцы можна пазнаёміцца з шэрагам аб'ектаў. Як, напрыклад, пры наведванні плошчы імя У.І. Леніна. Мы зрабілі яе прыкладную схему, у адпаведнасці з тэмай экскурсійнага маршруту.



Рэпазіторый ВДУ




Заўвагі:

1. На доме № 2 па вул. Гараўца знаходзіцца мемарыяльная дошка ў гонар Героя Савецкага Саюза лётчыка А. Гараўца, які ў адным паветраным баі з фашысцкімі лётчыкамі збіў 9 самалётаў.

2. Помнік герою Савецкага Саюза А. Гараўцу.

3. Будынак Віцебскай абласной філармоніі – помнік пасляваеннай савецкай архітэктуры другой паловы 1950-х гадоў (архітэктар А. Ефрамёнак).

4. Помнік У.І. Леніну (скульптары Г. Агапаў, М. Аляксеенка, архітэктар П. Ютчанка).

Зробім тлумачэнне. Радыус тэрыторыі, якая прапануецца ад цэнтра плошчы (ад помніка У.І. Леніну) 500–600 м (найбольш аддаленыя ад плошчы вуліцы імя Путны і імя Грыбаедава). Па акружнасці плошчы і непасрэдна мяжуюць з ёй вуліцы імя Урыцкага, Гараўца, У. Леніна, Чэхава, Гагарына, Люднікава. Тут прадстаўлена цікавае спалучэнне вуліц з прозвішчамі гістарычных асоб, пісьменнікаў, удзельнікаў Вялікай

Репозиторий ВГУ

Айчыннай вайны, першага касманаўта СССР. Знайсці ж іншыя цікавыя мясціны ў горадзе – гэта ўжо задача настаўніка (выкладчыка).

Але не менш цікавай можа быць і віртуальная экскурсія. Віртуальная ў тым сэнсе, што класу ці групе навучэнцаў зусім не абавязкова наведваць тыя вуліцы, якія абраны для азнаямлення. Матэрыял (дакументальны, гукавы, абавязкова, відэа, літаратурны) падрыхтуе група навучэнцаў, якія далі згоду настаўніку (выкладчыку) на ўдзел у яго зборы. Пасля таго як сабраныя матэрыялы будуць сістэматызаваны і адаптаваны, настаўніку (выкладчыку) і яго даследчыцкай групе можна выходзіць на ўрок.

**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант.
II. Уступнае (тлумачальнае) слова настаўніка (выкладчыка).
III. Паведамленне навучэнцаў. (Магчыма, дыспут)
IV. Падвядзенне вынікаў. Заключнае слова настаўніка (выкладчыка).

Такія мікрадаследчыцкія групы можна фарміраваць па меры з'яўлення інтарэсаў у навучэнцаў да такой работы. На наш погляд, гэта даволі прывабны метад далучэння навучэнцаў да пазнавальных, даследчыцкіх пошукаў. Канечне, вывучыць усе «фамільныя» вуліцы – задача для навучэнцаў не рэальная. Ды ў такой форме яна і не ставіцца. Нашы рэкамендацыі зводзяцца да таго, каб, апрача найбольш агульных ведаў аб віцебскіх вуліцах з прозвішчамі вядомых асоб, выйсці на абавязковае вывучэнне гісторыі такіх вуліц у межах мікрараёна школы. Калі такую работу ўдасца арганізаваць, то ў рэшце рэшт можна будзе з упэўненасцю разважаць аб тым, што пазнанне сваёй малой Радзімы адбылося.

***Літаратура***


1. Витебск. Энциклопедический справочник. – Минск, 1988.
2. Витебск. Витебский район. План города и района. – Минск, 2002.
3. Мезенко, А.М. Имя внутригородского объекта. О урбанимах Беларуси XVI – нач. XX в. / А.М. Мезенко. – Минск, 2003.
4. Мезэнка, Г.М. Віцебшчына ў назвах вуліц: у 2 ч. / Г.М. Мезэнка. – Віцебск, 2002. – Ч. 2.
5. Витебск. Атлас. – Минск, 2010.


Репозиторий ВГУ

# IX. У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКУ

## Слоўнік тэрмінаў

***Абарончыя збудаванні*** – штучныя перашкоды, прызначаныя для доўгатэрміновай абароны населенага пункта ці пэўнай тэрыторыі ад праціўніка. У раннефеадальным Віцебску выкарыстоўваліся равы, валы, драўляныя сцены, вежы. Пазней былі ўтвораны некалькі ліній абароны, якія ахоплівалі цэнтр горада і пасады.

***Адраджэнне*** (Рэнесанс, франц. Renaissance ) – культурна-гістарычная эпоха XIV–XVI стст., якая прыйшла ў Еўропу на змену готыцы.

На Беларусі Адраджэнне склалася ў XV–XVI стст. У архітэктуры Беларусі Адраджэнне праявілася ў адыходзе ў сакральным дойлідстве ад абарончых рыс да велічных, пластычных форм (глаў, купалоў) з прасторным, насычаным святлом, адкрытым увысь інтэр’ерам (фарны касцёл у Нясвіжы і інш.), у палацава-замкавым дойлідстве да палацавых, высакародных форм (Мір, Нясвіж), з’яўленні пабудоў новага тыпу: ратушы, гандлёвыя рады, сядзібныя палацы.

***Агмень*** – старажытнае прыстасаванне з камянёў-валуноў для ўтрымання агню ў жытле для абагрэву і прыгатавання ежы.

***Алтар*** (лац. altariaagaltus – высокі) – сакраментальная частка (свяцілішча, месца свяшчэнных атрыбутаў) культавай пабудовы (прытвор, неф, алтар), у якой знаходзіліся прастол (горнае месца) і іншыя атрыбуты рытуалу набажэнства.

***Альтанка*** (італ. altana) – круглае ў плане слупавое збудаванне, завершанае купалам, месца адпачынку ў парку. Вядомы капліцы-альтанкі, а таксама цэрквы-альтанкі, як правіла, сядзібныя, могілкавыя.

***Ампір*** (франц. empire) – мастацка-стылістычны напрамак, які ўзнік на пачатку XIX ст. у Францыі. Вылучаецца рысамі манументальнасці, урачыстасці, уключэннем элементаў ваеннай эмблематыкі ў дэкаратыўных і арнаментальных кампазіцыях.

***Ансамбль*** (франц. ensemble) – цэласнае, супадпарадкаванае размяшчэнне пабудоў, якія ствараюць зручнае асяроддзе, сумаштабнае ландшафту і арганічна з ім спалучанае.

***Анфілада*** (франц. enfilade) – паслядоўнае размяшчэнне пакояў (залаў), кожны з якіх, акрамя апошняга, з’яўляецца прахадным.

***Апсіда*** (грэч. hapsis (hapsidos) – паўкруглая, прамавугольная альбо гранёная частка бажніцы, якая выступае за межы сцяны і мае ўласнае перакрыццё. У апсідзе знаходзяцца алтар, клір, месцы для вышэйшых духоўных і свецкіх асоб, культавыя рэліквіі і г.д.

***Археалагічная культура*** – гістарычная агульнасць археалагічных помнікаў, што існавалі на акрэсленай тэрыторыі прыкладна ў адзін час і

Репозиторий ВГУ

аднастайныя па сваёй матэрыяльнай культуры, але істотна адрозніваюцца ад адначасовых помнікаў суседніх абласцей.

***Археалогія*** (археа і грэч. logos) – навука, якая па рэчавых вытоках (прылады працы і створаныя з іх дапамогай пабудовы, зброя, упрыгожванні, посуд, творы мастацтва і інш.) вывучае гістарычнае мінулае чалавецтва.

***Архітэктура*** (грэч. arshitektonike) – будаўнічае мастацтва, від стваральнай дзейнасці чалавека і чалавецтва, прадметам якога з'яўляецца асяроддзе жыццядзейнасці, духоўнага і культурнага існавання, працы людзей. Крыніцай архітэктуры канкрэтнага народа, нацыі з'яўляецца народна-традыцыйнае дойлідства.

***Базіліка*** (грэч. basilike) – тып антычнага, потым сярэднявечнага будынка, прамавугольнага ў плане, падзеленага ўздоўж радамі калон на некалькі (звычайна – 3, радзей – 5) частак (т.зв. караблёў або нефаў). Сярэдні неф, завершаны апсідай, вышэйшы і шырэйшы за бакавыя.

***Балкон*** (італ. balkone ад познелац. balkus – бэлька) – агароджаная пляцоўка на кансолях, якая выступае за плоскасць сцяны.

***Барока*** (італ. barokko) – культурна-гістарычная эпоха XVII–XVIII стст., якая сімвалізуе перамогу свецкага, асветніцкага светапогляду. Барока – гэта ўвасабленне прыгажосці, аптымізму, узнёсласці, адлюстраваных у пластычных і дынамічных архітэктурных формах.

***Баронікі*** – гарадзішча днепра-дзвінскай археалагічнай культуры. Знаходзіцца на беразе ракі Лучоса, каля в. Баронікі Віцебскага раёна. Датуецца V ст. да н.э. – IV–V стст. н.э.

***Брама*** – збудаванне, найчасцей яруснай кампазіцыі, з каменя ці дрэва, з уваходам у горад, замак, двор, манастыр ці іншы замкнёны комплекс пабудоў.

***Вакольны горад*** – частка старажытна-рускага горада (у тым ліку і Віцебска) побач з дзядзінцам, абнесеная валамі і равамі.

***Вежка*** – зрубавая вышынная (ярусная) канструкцыя ў драўляных умацаваннях гарадоў, дзядзінцаў, замкаў.

***Веранда*** (ад англ. veranda) – пераважна закрытая халодная прыбудова з боку ўваходных дзвярэй. Склалася шляхам удасканалення і развіцця ганка.

***Віцебскі Верхні замак*** – існаваў у XIV–XVIII стст. Размяшчаўся на левым беразе р. Віцьба пры ўпадзенні яе ў Заходнюю Дзвіну. З поўначы быў абмежаваны Віцьбай, з Захаду – Заходняй Дзвіной, на поўдні і ўсходзе межаваў з віцебскім Ніжнім замкам. Ва ўсходняй яго частцы знаходзілася Замкавая гара (у пісьмовых крыніцах называлася гара Ламіха. Вышыня каля 15 м. У канцы XIX ст. амаль поўнасцю скапана). Верхні замак быў пабудаваны на дзядзінцы старажытнага Віцебска. Паводле пісьмовых крыніц, сваю назву «Верхні замак Віцебска» атрымаў у 1352 г. (больш дэталёвыя звесткі можна атрымаць у энцыклапедычных і гістарычных выданнях. Напрыклад, у энцыклапедыі altaria «Археалогія і нумізматыка Беларусі». – Мінск, 1993. – С. 134–135).

Репозиторий ВГУ

***Віцебскі летапіс*** – помнік гарадскога летапісання Беларусі XVIII ст. Складзены ў 1768 г. на польскай мове жыхаром Віцебска С. Аверкам на аснове мясцовага летапісу М. Панцырнага (звесткі за 896–1709 гг.), кароткіх гістарычных запісаў Чарноўскіх (1601–1633 гг.) і Г. Аверкі (1733–1757 гг.), а таксама матэрыялаў, сабраных аўтарамі. Твор кампіляцыйны, не мае літаратурнай цэласнасці і кампазіцыйнай стройнасці. Упершыню апублікаваны А. Сапуновым у «Витебской старине» (1883 г.).

***Вугал*** – месца злучэння бярвёнаў, брусоў, дыляў у вянец. Існуюць два асноўныя тыпы – просты (са знешнімі выпускамі) і чысты (без астатку) вуглы.

***Галерэя*** (франц. galerie, ад італ. galleria) – 1) бакавыя памяшканні з вокнамі, прыбудаваныя да асноўнага аб'ёму храма XI–XII стст.; 2) доўгае крытае светлае памяшканне, у якім адну вокнавую падоўжаную сцяну замяняе каланада; 3) спецыяльныя зальныя памяшканні ў палацах, асветленыя суцэльным радам вялікіх вокнаў; 4) калідор з суцэльнымі аконнымі праёмамі на адным з падоўжаных бакоў будынка. На Беларусі ў XVI–XVIII стст. існавалі ў манастырах і кляштарах.

***Гандлёвыя рады*** – збудаванне, якое звычайна размяшчалася на гандлёвай плошчы мястэчка, горада.

***Гарадзішча,*** град – раннеславянскае драўлянае ўмацаванне, уладкаванае ў зручным прыродным асяроддзі (ля сутокаў рэк, на ўзвышшы) ці ў цяжкадаступнай мясцовасці (балотныя гарадзішчы).

***Гасцінец*** – сухапутны шлях зносін з інтэнсіўным рухам, тэхнічна абсталяваны, з грунтавым, булыжным ці брукаваным пакрыццём, дарожнымі знакамі (вёрставымі слупамі, указальнікамі), пунктамі прыдарожнага абслугоўвання (заезныя дамы, корчмы, паштовыя станцыі).

***Готыка*** (італ. gotiko – літар. гоцкі, ад назвы герм. племя готаў) – культурна-гістарычная эпоха перыяду позняга сярэднявечча (XIV–XV стст.). Радзіма готыкі – Францыя. Вылучаецца ранняя готыка (XII ст.), сярэдняя, або сталая (XIII–XIV стст.), і позняя, або «палымянная» (XV ст.). Готыка найбольш ярка ўвасобілася ў архітэктуры. Сутнасць гатычнай архітэктуры ў замене груваcткіх і змрочных раманскіх пабудоў канструкцыямі на аснове каменнага каркаса: нясучых слупоў, калон, усталяваных на каменных рэбрах скляпенняў (зорчатыя скляпенні), арачных апор (аркбутанаў).

***Данжон*** (франц. donjon) – галоўная вежа замка, якая служыла месцам абароны і ўкрыццём пры нападзе ворага.

***Двор*** (сядзіба) – у традыцыйным народным жыллі комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў. Фарміраванне забудовы двара як цэласнага ансамбля абумоўлена аб'ёмна-пасторавым адзінствам ці самастойнасцю пабудоў і звёнаў (пабудовы пад агульнай страхой ці наадварот).

***Дзядзінец*** – драўлянае ўмацаванне раннеславянскіх гарадоў. Размяшчаўся ў цэнтральнай частцы горада, у месцы, зручным для абароны (сутокі рэк, ручаёў, бераг возера, узвышша і г.д.). Своеасаблівы цэнтр

Рэпазіторый ВДУ

горада, дзе размяшчаліся адміністрацыйныя і культавыя пабудовы, жылі князь з дружынай, яго чэлядзь, гандляры, рамеснікі, духавенства. Плошча Віцебскага дзядзінца (асновы Верхняга замка) была каля 2,5 га.

***Дойлідства, архітэктура*** – адно з найстаражытнейшых рамёстваў, галіна стваральнай дзейнасці беларусаў. Прадметам з'яўлялася эвалюцыяніруючае традыцыйнае мастацтва ствараць абарончыя, культавыя, палацавыя, жылыя, гаспадарчыя і вытворчыя збудаванні.

***Замак*** – замкнуты комплекс з абарончых элементаў і жылых пабудоў, абведзены лініяй умацаванняў з зямлі, дрэва і каменю. У Віцебску існавалі «Верхні замак», «Ніжні (Дольны) замак» і «Узгорскі замак».

***Зандаж*** – абмежаванае на плошчы раскрыццё помніка архітэктуры з мэтай яго вывучэння і рэстаўрацыі. Праводзіцца такім чынам, каб нанесці будынку як мага менш страт. Зандажам звычайна надаюць правільныя, геаметрычныя абрысы, каб потым іх можна было ўключыць у музейную экспазіцыю.

***Званіца*** – вежападобнае збудаванне каля царквы або касцёла ці непасрэдна ў архітэктуры апошніх для падвешвання званоў.

***Зорчатае скляпенне*** – скляпенне, якое ўсталявана на нясучых каменных рэбрах (нервюрах), пры гэтым лініі размеркавання сіл (азначыць, і напрамку нервюр) утвараюць сіметрычную сістэму накшталт шматпрамянёвай зоркі.

***Іканастас*** (грэч. еікоп – вобраз + eikon – месца стаяння) – каркасна-шчытавая канструкцыя, якая падзяляе ў царкве прастору нефа (літургічнага памяшкання) і прастору алтара (сакрламентальнага памяшкання).

***Кампазіцыя*** (лац. kompositum – складаны, складаючы) – аб'ёмна-прастораваe рашэнне, функцыянальнае, рацыянальнае і задавальняючае патрабаванням эстэтыкі размяшчэнне частак пабудовы (аб'ёмаў) у цэлым ці будынкаў у комплексе, ансамблі.

***Канелюры*** (франц. cannelure) – вертыкальныя дэкаратыўныя жалабкі на паверхні калоны, пілястраў.

***Канструктывізм*** – мастацка-стылістычны напрамак, які склаўся ў першай трэці XX ст. пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу, тэхналагічных дасягненняў у канструкцыях і матэрыялах. Кампазіцыйнае і аб'ёмна-прасторавае рашэнне К. будуецца на выразнасці канструкцыйна-статычнай схемы будынка, эстэтычная выразнасць цалкам дасягаецца сродкамі прапорцый, маштабаў, суадносін сцен і праёмаў, светлаценявых эфектаў.

***Капліца*** (лац. capeie) – невялікая культавая пабудова. Прызначалася для адпраўлення пэўных культавых патрэб: адпявання (могілкавыя капліцы), урачыстых малітваў пры хрэсных ходах (прыдарожныя капліцы).

***Карніз*** (грэч. karonis – завяршэнне) – уладкаванне на кансольных выпусках верхніх бярвёнаў зруба і бэлек, падшыўка пад схіламі і дахамі.



Рэпазіторый ВДУ

***Касцёл*** (польск. kosciol) – каталіцкая культавая пабудова на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны.

***Кафля*** (нем. kashel) – керамічны выраб для абліцоўкі і дэкаратыўнага аздаблення печаў.

***Класіцызм*** (лац. classicus – узорны) – культурна-гістарычная эпоха другой паловы XVII – пачатку XIX ст., што ўзнікла на шырокім асветніцкім руху, адыходзе ад царкоўнага і манархічнага абсалютызму да свецкасці, дэмакратычных ідэалаў. Архітэктуры К. уласцівы рацыянальнасць і мэтазгоднасць форм, стрыманасць, пачуццё густу.

***Круглік*** – драўляная вежа шасці-, васьміграннай канфігурацыі ў плане.

***Крыжова-купальная сістэма*** – архітэктурная сістэма (кампазіцыя), у якой да падкупальнай прасторы ў цэнтры храма звернуты цыліндрычныя скляпенні галін крыжа, якія ў цэлым ствараюць крыжападобную структуру.

***Купал*** (італ. cupala, лац. cupula – бочачка) – паўсферычнае перакрыццё, якое завяршае пабудову. Характэрна для культавых пабудоў і зальных памяшканняў, палацаў, дзе неабходна значная ўнутраная прастора. Па канструкцыі адрозніваюцца К. мураваныя і каркасныя.

***Лазня*** – спецыяльнае збудаванне для мыцця і прання. Мяжа распаўсюджвання на Беларусі з усходу на захад праходзіць прыкладна па Беразіне.

***Літургія*** – богаслужэнне, у якім выкладаецца сутнасць асноўных ідэй хрысціянскага светапогляду.

***Мадэрн*** (франц. modern – сучасны) – мастацка-стылістычны напрамак канца XIX – пачатку XX ст. Узнік на хвалі пошуку архітэктурных і мастацкіх форм для будынкаў новага сацыяльна-грамадскага прызначэння: даходных дамоў, банкаў, біржаў, вакзалаў і г.д. М. знайшоў праяўленне і ў аздабленні інтэр’ераў, прадметах побыту (мэбля, посуд), жывапісе.

***Манастыр*** (грэч. топазіегіоп) – ансамбль сакральных, жылых і гаспадарчых пабудоў абшчыны манахаў.

***Маньерызм*** (італ. manierismo, ад maniera) – плынь у еўрапейскім мастацтве XVI ст., якая адлюстравала крызіс гуманістычнай культуры Адраджэння. У архітэктуры маньерызму прыкметна імкненне да празмернага падкрэслівання асобных дэталяў дэкору.

***Машыкулі*** (франц. machicoulis) – у замках і крэпасцях навясныя байніцы.

***Муроўка*** (ням. mauer – каменная сцяна, агароджа) – маналітная канструкцыя (падмурак, слуп, сцяна) з каменя, цэглы ці з іх спалучэння на звязваючым рэчыве (вапне, цаглянцы, цэменце, бетоне).

***Мястэчка*** – рамесна-гандлёвы тып паселішча. Узнік у XV ст. у сувязі з распаўсюджваннем грашовай рэнты. З пункту гледжання сацыяльна-прававых адносін вылучаліся прыватнаўладальніцкія і дзяржаўныя М. Ядром фарміравання забудовы М. з’яўлялася плошча з



Репозиторий ВГУ

гандлёвымі радамі, вакол якой размяшчаліся царква, касцёл, адміністрацыйныя будынкі, дамы-крамы рамеснікаў-гандляроў.

***Мячэць*** (араб, масджыд) – культавая пабудова веравызначэння ісламу (мусульман). На Беларусі першыя М. з'явіліся ў XV–XVI стст. у сувязі з фарміраваннем асад татар з Залатой Арды і Крыма, якія добраахвотна прыйшлі на службу ў Вялікае Княства Літоўскае.

***Неабарока*** (грэч. neos – новы + барока) – умоўная назва кірунку ў архітэктуры другой паловы XIX – пачатку XX ст., які пераймаў формы, элементы кампазіцыі будынкаў стылю барока.

***Неакласіцызм*** (грэч. neos – новы + класіцызм) – прадаўжэнне эстэтычных прынцыпаў класіцызму ў новых умовах развіцця мастацкай культуры.

***Ніжні замак Віцебска*** – размяшчаўся на поўдзень і паўднёвы ўсход ад віцебскага Верхняга замка. З поўдня і ўсходу быў абмежаваны ручаём, а з захаду – р. Заходняя Дзвіна. Паводле пісьмовых крыніц Ніжні замак узведзены каля 1330–1350 гг. князем Альгердам як знешняя лінія абароны вакол гандлёва-рамеснага пасада. У лініі ўмацаванняў замка было сем мураваных вежаў. Замак існаваў да XVIII ст.

***Ордэр*** (лац. ordo – рад, парадак) – стоечна-бялечная канструкцыя, якая пераўтваралася ў выніку эвалюцыі ў чатыры мастацка-архітэктурныя тыпы О.: дарэчны, іанічны, карынфскі, тасканскі.

***Палац*** (ад агульна сл. Палаты) – жыллё, рэзідэнцыя главы дзяржавы ці правінцыі, буйнога феадала (князя), землеўладальніка або іншай асобы, якая валодае маёмасцю і сродкамі і мае адпаведнае грамадскае становішча.

***Партал*** (лац. porta – уваход, вароты) – вялікі праём, праезд ў сцяне.

***Пасад*** (прадграддзе, прадмесце) – гандлёва-рамесніцкая частка феадальнага горада X–XVIII стст., жыхары якой аб'ядноўваліся ў абшчыну з самакіраваннем. Умацаваная частка пасада мела назву вакольнага горада. Пасад звычайна размяшчаўся вакол дзядзінца. Віцебскі пасад – гэта тэрыторыя, прымыкаючая да Верхняга і Ніжняга замкаў.

***Пілон*** (грэч. pylon – уваход, брама) – масіўная вертыкальная апора прамавугольнага сячэння.

***Пілястра, пілястр*** (італ. pilastro ад лац. pila – калона, слуп) – плоскі вертыкальны прамавугольны ў плане выступ на сцяне або слупе.

***План*** (лац. planum – плоскасць) – гарызантальная праекцыя будынка на пэўнай вышыні (адметцы), якая атрымліваецца на ўяўляемай (умоўнай) сякучай плоскасці, з наказам у сячэнні вертыкальных нясучых канструкцый (калоны), знешніх і ўнутраных сцен.

***Плінфа (***грэч. plinthos – цагліна) – шырокая і плоская абпаленая цэгла.

***Прадмесце*** – у XIV–XVII стст. пад прадмесцямі разумелі таксама кварталы, заселеныя гандлярамі і рамеснікамі.

Рэпазіторый ВДУ

***Ракако*** (франц. rococo) – мастацка-стылістычны напрамак, які склаўся ў другой палове XVIII ст. у нетрах барока, праяўленне вычурнай, знарок перанасычанай раскошай, дваранска-арыстакратычнай культуры, што страціла ва ўмовах прамыслова-рыначных адносін гістарычную перспектыву. Пышны, зааморфнага паходжання дэкор пранізвае ўсю матэрыяльную бытнасць: ад посуду, мэблі, адзення да архітэктуры.

***Раманскі стыль*** – стыль сярэднявечнага заходнееўрапейскага мастацтва X–XIII стст. Збудаванні вызначаліся манументальнасцю, масіўнасцю канструкцый, аздабляліся абстрактна-геаметрычным арнаментам і скульптурай. Спачатку будынкі мелі плоскія драўляныя перакрыцці, пазней – цыліндрычныя і нарэшце – крыжовыя.

***Рамантызм*** (франц. romantisme) – мастацкі метад, які склаўся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. У архітэктуры Р. выявіўся ў захапленні архаікай, экзотыкай, гістарычным і нацыянальным матэрыялам, а таксама ў паглыбленні ў сімвалізм і дэкаратыўнасць.

***Ратонда*** (лац. rotondus, італ. rotunda – круглы) – круглае ў плане збудаванне, акружанае калонамі і завершанае купалам.

***Ратуша*** (ням. Rathaus, Rat – рада + Наиз –дом) – будынак органаў гарадскога самакіравання. У Заходняй Еўропе Р. з’явіліся ў XII ст., на Беларусі – з XIV ст.

***Рацыяналізм*** (франц. гаіiопаіізте ад лац. rationalis – разумны) – сукупнасць архітэктурных кірункаў першай паловы XX ст., якія праграмна асвойвалі дасягненні навукі і тэхнікі.

***Руст*** – спосаб апрацоўкі каменя або імітаванага пад камень абліцовачнага матэрыялу, пры якім кожны камень ці яго імітацыя вылучаюцца перыметральным кантам рознай формы.

***Рызаліт*** (італ. risalita – выступ) – частка будынка, якая выступае за лінію фасада на ўсю яго вышыню.

***Сакрысція*** – бакавое памяшканне ў хрысціянскай бажніцы, прыбудова з паўднёвага або паўночнага боку, што дапасуецца да абсіднай часткі храма. У ёй звычайна захоўваўся літургічны рыштунак, ксяндзы рыхтаваліся да літургічных абрадаў.

***Скляпенне*** – нясучая пасторавая канструкцыя для перакрыцця ці накрыцця збудаванняў, якая мае крывалінейны абрыс. Скляпенне бывае розных формаў: цыліндрычнае, крыжовае, люстраное. Разнавіднасць скляпення – купал.

***Слупавая канструкцыя*** – найбольш архаічны тып канструкцыі ў народным дойлідстве.

***Страха*** – тып завяршэння традыцыйных пабудоў народнага жылля з саламяным ці чаротавым (або змешаным) пакрыццём (у адрозненне ад даху, пакрытага дранкай, дорам ці дахоўкай).

***Трансепт*** (лац. traseptum) – у сакральных пабудовах (царкве, касцёле) папярочная (перпендыкулярная асноўнай) рытуальная зала (неф).



Рэпазіторый ВДУ

***Трыконх*** – архітэктурная кампазіцыя з трох паўакружнасцей, звернутых да цэнтральнай падкупальнай прасторы бажніцы з усходняга паўночнага і паўднёвага яе бакоў.

***Трысцен*** – канструкцыйны прыём народнага дойлідства, зруб з трох сценак, які праз шулы далучаецца да зруба-чатырохсцена (напрыклад, сенцы да хаты, прыстопка да істопкі, прылазнік да лазні і г.д.).

***Узгорскі замак*** Віцебска размяшчаўся на поўнач ад Верхняга і Ніжняга замкаў, паміж рэкамі Заходняя Дзвіна і Віцьба (на яе правым беразе). Займаў частку ўзвышша Узгор'е, а таксама Лысую (Успенскую) гару. Меў плошчу каля 10 га амаль прамавугольнай формы. Сваё развіццё атрымаў у XIII–XV стст. – былі пабудаваны Успенская, Васкрасенская (Рыначная), Увядзенская цэрквы, пазней – драўляная ратуша, Гасціны двор, гандлёвыя рады. У канцы XVI ст. на Узгор'е з Ніжняга замка быў перанесены гандлёва-эканамічны цэнтр Віцебска. Перастаў існаваць у XVIII ст.

***Фасад*** (франц. fasade, італ. facciata, fassia – твар) – праекцыя вонкавага выгляду будынка з паказам лініі зямлі, падмурка, сцен, даху, праёмаў у пэўным маштабе.

***Флігель*** (ням. Flügel) – дадатковая прыбудова да жылога дома або асобны будынак, які ўваходзіў у сядзібны комплекс.

***Франтон*** (лац. frons, frontis) – пярэдняя частка (звычайна ў выглядзе трохвугольніка) фасада будынка, порціка, каланады, абмежаваная схіламі даху і карнізам.

***Хоры*** (грэч. choros) – у культавай пабудове спецыяльны балкон для пеўчых, размяшчэння фісгармоніі, аргана.

***Цамянка*** – сумесь вапны с дробна патоўчанай цэглай, вяжучы матэрыял, які ў XI–XIII стст. ужываўся ў мураваным дойлідстве для муроўкі плінфы, валуноў і г.д.

***Царква*** (грэч. kuriakeoikia – божы дом) – хрысціянскае сакральнае збудаванне. На Беларусі традыцыйна пад Ц. разумеюць праваслаўны храм у адрозненне ад каталіцкага касцёла.

***Цокаль*** – ніжняя частка вонкавай сцяны будынка над падмуркам. Узнік як умацаванне гэтай часткі сцяны, часта дэкарыруецца.

***Цыліндрычнае скляпенне*** – перакрыццё, якое мае ў разрэзе профіль паўаркі. Пры гэтым унутраная прастора (пралёт) пазбаўлялася прамежкавых апор. Маса скляпення перадавалася непасрэдна на сцены.

***Чарапіца*** – дахоўка, адзін са старажытных керамічных штучных матэрыялаў пакрыцця даху, вядомы з часоў Старажытнага Рыма. Вырабляецца з пластычных гатункаў глін шляхам фармавання. Вядома плоская і фігурная Ч., у залежнасці ад дабавак мае чырвоны ці шэра-тэракотавы колер.

***Шалёўка*** – спосаб дэкаратыўна-пластычнага аздаблення ў драўляным дойлідстве.

Репозиторий ВГУ

***Шчыт*** – частка драўлянага будынка, абмежаваная верхам сцяны і схілам даху (франтон).

***Эклектызм*** (грэч. eklertikos – той, хто выбірае) – мастацка-стылістычны напрамак XIX – пачатку XX ст. Пачатак Э. вядомы як перыяд рамантызму, звароту ў архітэктуры і мастацтве да экзатычных форм папярэдніх эпох і розных нацыянальных культур. Рамантызм найбольш ярка выявіўся ў сядзібна-паркавай архітэктуры (гроты, альтанкі, сажалкі, флігелі і палацы ў стылі казачных замкаў, клумбы дрэў (ліп), шматлікія раслінныя экзоты і г.д.). У сакральнай і грамадзянскай архітэктуры Э. праявіўся як псеўдаадраджэнне раманскіх, гатычных і іншых форм. Адсюль Э. іншы раз называюць стылем гістарызму.

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ


Уводзіны…………………………………..………………...………… 3

I. Аглядная экскурсія па старажытным Віцебску ……….……..… 5

II. Экскурсія па Верхнім замку ………………………..…………..… 10

III. Экскурсія па Ніжнім замку ………………………...……………..… 14

IV. Экскурсія па Узгорскім замку …………………….……………..… 17

V. Экскурсія па Задзвінні ……………………………...……..…..…… 21

VI. Экскурсія «Па ваколіцах Віцебска» …………………………….…… 28

VII. Экскурсія «Мемарыяльныя дошкі на будынках г. Віцебска» … 28

VIII. Экскурсія «Гарадскія вуліцы носяць іх імя» …..………..……..... 34

IX. У дапамогу настаўніку (слоўнік тэрмінаў) …..……………………. 38


Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**РУСЕЦКІ** Аркадзій Уладзіміравіч

# ВЫВУЧАЦЬ І ВЕДАЦЬ ГІСТОРЫЮ ВІЦЕБСКА (ДА ПАЧАТКАЎ «ВІЦЕБСКАЗНАЎСТВА»)

Метадычны дапаможнік


Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Карэктар *Л.В. Малажавая*

Камп’ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк . Фармат 60x84$^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,79. Ул.-выд. арк. 2,30. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
ЛВ № 02330/110 ад 30.01.2013.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ